Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І КАЗАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
16 чэрвеня 1931 г.
№ 136 (3225)

Адна-Ленінская 31
Гос. публ. бібліятэка
№ Вр. янв. 32 г. | СВ. - 1

Падрыхтоўку да ўборачнай — на баявыя рэйкі!

Надыходзяць апошнія дні веснавой сяўбы. Паводле эводкі НКЗ БССР плян сяўбы на 10-га чэрвеня выкананы толькі на 74,4 проц. Такія тэмпы ні ў якім разе нас ня могуць здаволіць. Частка раёнаў яшчэ не дабілася пачаючага пералому ў веснавой сяўбе. Частка раёнаў цягнецца ў хвасьце, не разьвіла бальшавіцкіх тэмпаў і выкананьні плянаў сяўбы, не мабілізавала шырачэзныя масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, не дала пачатага адпору праваапартуністычнай стаўцы на самацёк.

Дырэктывы партыі і ўраду аб хутчэйшым і поўным выкананьні плянаў сяўбы другой бальшавіцкай павінны быць выкананы абавязкова. Адначасна з гэтым, ужо зараз безадкладна неабходна пераключацца на баявую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Але, як сьведчыць друкуемая сёньня пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР, папярэдняя праверка падрыхтаванасьці цэнтральных установаў да ўборачнай кампаніі паказала, што яшчэ да гэтага часу НКЗ і гаспадарча-капэрацыйныя арганізацыі не пераключыліся ў належнай ступені на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Белкалгасцэнтр, саўгасаб'яднаньні і МТС, апэрацыйныя цэнтры спазьнілі са складаньнем плянаў уборачнай кампаніі і да гэтага часу яшчэ ня спусьцілі іх у нізавую сетку. І гэта, ня гледзячы на дырэктыву ЦК КП(б)Б аб тэрмінах распрацоўкі плянаў і неабходнасьці хутчэй іх давесьці да мас.

Забясьпечаньне с-г. машынамі і інвэнтаром, рамонт іх—зьяўляюцца адным з асноўных сродкаў пасьпяховасьці правядзеньня ўборачнай. Але Белгасснаб і Белкаапсаюз, якія адказваюць за своечасовы завоз с-г. машын і інвэнтара, зусім мала клапацяцца аб гэтай справе. Сенаўборка пачынаецца праз 1-2 тыдні, а сенакасілак завезена толькі 70 проц. плану, конных грабель—32 проц., кос—17 проц.

Уборка тэхнічных культур—адказьнейшае зьвяно ва ўборачнай кампаніі, асабліва памятуючы тое, што ў мінулым годзе ў нас, у БССР, меліся значныя прарывы ў гэтай справе. Ня гледзячы на гэта, лёнаўборачных машын яшчэ зусім да гэтага часу не завезена. Мала гэтага, нават тыя с-гасп. машыны і інвэнтар, якія маюцца на складах Белсельснабу і райкаапсаюзаў, рэалізуюцца вельмі дрэнна—на 1-га чэрвеня рэалізавана ўсяго толькі 50 проц. маючыхся на складзе.

Ня выконваюцца таксама і баявыя заданьні па вырабу с-г. машын (бульбакапалкі, лёнамашыны і інш.) і запасных частак для малатарняў, прывадоў і інш. Трыкутнікі прадпрыемстваў, якія вырабляюць с-г. машыны і часткі машын, павінны бальшавіцкімі тэмпамі, мабілізуючы рабочыя масы, абавязкова ліквідаваць прарывы на гэтым фронце, поўнасьцю і ў тэрмін выканаць свае вытворчыя праграмы.

Арганізацыя працы, пераход на зьдзельшчыну ўсіх саўгасаў і калгасаў зьяўляюцца асноўным зьвяном, як веснавой сяўбы, так, асабліва, і пасьпяховасьці правядзеньня ўборачнай. І ў гэтай справе няма яшчэ бальшавіцкіх тэмпаў. Да гэтага часу яшчэ ня ўсе саўгасы і калгасы перайшлі на зьдзельшчыну. Адпаведныя цэнтральныя ўстановы яшчэ не наладзілі належнага падліку і падагульваньня выніковаў пераходу саўгасаў і калгасаў на зьдзельную аплату працы. Нормы выпрацоўкі ў часе ўборкі ўраджаю па саўгасам, апроч сенакашэньня, па трэсту «Сьвінавод» да гэтага часу ня даведзены.

НКЗ БССР не распрацаваў таксама пляну дагаворнай кампаніі аб узаемадапамозе паміж саўгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі. Дырэктывы СНК БССР і НКЗ СССР аб стварэньні фондаў для прэміяваньня лепшых саўгасаў і калгасаў, рабочых саўгасаў і калгасьнікаў-ударнікаў да гэтага часу ня выкананы.

Вырашэньне кармовай праблемы ў значнай ступені залежыць ад таго, як будзе падрыхтавана і праведзена сілосная кампанія. А між тым, плян засеву сілосных культур на 5-га чэрвеня гэтага году выкананы ўсяго толькі на 11,7 проц., а будаўніцтва сілосных траншэй і ям да гэтага часу амаль яшчэ не распачата. Барацьба за мільён тон сілакаваньня ў БССР зьяўляецца барацьбой за пасьпяховае вырашэньне кармовай праблемы. Сілаваньне пачнецца ў куткім часе. Трэба па-баявому гэту работу распачаць.

Ні на хвіліну не паслабляючы, а ўсё павялічваючы тэмпы пасьпяховага скончэньня сяўбы, трэба зараз-жа, неадкладна прыступіць да баявой падрыхтоўкі выкананьня плянаў уборачнай. Посьпехі ўборачнай залежаць ад безадкладнага ліквідаваньня тых адставаньняў, якія адзначаны ў сёньняшняй пастанове камісіі выкананьня СНК БССР. Посьпехі ўборачнай залежаць ад таго, як раённыя партыйныя, камсамольскія, савецкія, прафэсыянальныя, калгасна-кааперацыйныя арганізацыі і гаспадарчыя аб'яднаньні мабілізуюць шырачэзныя масы рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на гэтую справу. Толькі пры гэтых умовах адказьнейшая гаспадарча-палітычная кампанія—уборка ўраджаю—будзе праведзена пасьпяхова і ў тэрмін.

У Камісіі Выкананьня

Пра падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі 1931 г.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры Савеце Народных Камісараў БССР

Выслухаўшы даклады Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага і становішчы падрыхтоўкі да ўборачнае кампаніі, прадстаўнікоў Белсельгасснабу тав. Будніка і Белмэталёб'яднаньня т. Сакаленка аб вырабу і забясьпечаньні сельскагаспадарчымі машынамі і інвэнтаром і садаклад прадстаўніка Народнага Камісарыята Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі тав. Бегося аб выніках папярэдняй праверкі падрыхтаванасьці цэнтральных устаноў да ўборачнае кампаніі, Камісія Выкананьня ўстанаўляе, што яшчэ да гэтага часу Народны Камісарыят Земляробства, гаспадарчыя і кааперацыйныя арганізацыі не пераключыліся ў належнай ступені да падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Аб гэтым сьведчыць наступнае:

а) Белкалгасцэнтр, саўгасаб'яднаньні і кааперацыйныя цэнтры (Белкаапсаюз, Сельскагаспадарчая кааперацыя) са вызьненьнем склалі пляны ўборачнай кампаніі і канчаткова ня спусьцілі іх у сваёй нізавой сетцы;

б) Белсельгасснаб і Белкаапсаюз не забясьпечылі своечасова завозу сельскагаспадарчых машын і інвэнтару (сенакасілак завезена 70 проц. плану, конных грабель—32 проц., кос—17 проц., лёнаўборачных машын яшчэ зусім не завезена).

Рэалізацыя сельскагаспадарчых машын і інвэнтару, з прычыны нядбайных адносін Белсельгасснабу і райкаапсаюзаў да гэтай справы, праходзіць надзвычайна марудна: на 1-е чэрвеня рэалізавана толькі 50 проц. маючыхся на складах;

в) Белмэталёб'яднаньне ня выканала заданьні па вырабу сельскагаспадарчых машын (бульбакапалкі, лёнамашыны па ачосу галовак), а таксама не выконваецца праграма вырабу і дачы запасных частак для малатарняў, прывадоў і інш.

г) Народны Камісарыят Земляробства і цэнтральныя гаспадарча-кааперацыйныя цэнтры не арганізавалі кантролю і падліку рамонту сельскагаспадарчых машын і інвэнтару;

д) сэктар кадраў Народнага Камісарыяту Земляробства, Белкалгасцэнтр і саўгасаб'яднаньні не забясьпечылі кіраваньня справай падрыхтоўкі кадраў арганізацыі працы ў саўгасах і калгасах да ўборкі ўраджаю. Дагаворы з узаемнай дапамозе паміж саўгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі да гэтага часу не заключаны. Дырэктывы СНК БССР і НКЗ СССР аб стварэньні фондаў для прэміяваньня лепшых саўгасаў, калгасаў, рабочых саўгасаў і калгасьнікаў-ударнікаў ня выкананы. Саўгасаб'яднаньні і Белкалгасцэнтр не надзялілі належнага падліку пераводу саўгасаў і калгасаў на зьдзельную аплату працы. Нормы выпрацоўкі ў час уборкі ўраджаю па саўгасам, апроч сенакашэньня па трэсту «Сьвінавод», не даны;

е) саўгасаб'яднаньні і Белкаапсаюз надзвычайна марудна праводзяць працу па будаўніцтву хавальнікаў насеньня, бульбы і гародніны. Пры чым па «Насеннаводу» і Белсельтрэсту гэтае будаўніцтва зусім не распачата;

ж) Белдзяржвыдавецтва не забясьпечыла ўборачную кампанію своечасовым выпускам папулярнай сельскагаспадарчай літаратуры;

з) падрыхтоўка да сіласнай кампаніі праходзіць зусім нездавальняча: плян засеву сіласных культур на 5 чэрвеня г. г. выкананы толькі на 11,7 проц., плян забясьпечаньня сіласарэзкамі—34 проц., а будаваньне сіласных траншэй і ям амаль зусім не распачата. Лесбел яшчэ не забясьпечыў поўнага выкананьня вырабу сіласных веж.

Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць Белкалгасцэнтру пад адказнасьць т. Міцькова і саўгасаб'яднаньням, пад адказнасьць т. т. Грэбенчыка, Аўчыньнікава і Мартэнсона, забясьпечыць складаньне ўсімі саўгасамі і калгасамі канкрэтных апэрацыйных плянаў уборкі ўраджаю не пазьней 20 чэрвеня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на сенакашэньне.

2. Абавязаць Белсельгасснаб, пад адказнасьць тав. Будніка, Белкаапсаюз пад адказнасьць т. Палонскага, Трактарацэнтр, пад адказнасьць т. Каршакевіча, забясьпечыць завоз сельскагаспадарчых машын і ўборачнага інвэнтару з такім разьлікам, каб яны былі атрыманы на месцах не пазьней канца чэрвеня месяца.

Прапанаваць Белсельгасснабу, цэнтрам сельскагаспадарчай кааперацыі, пад адказнасьць т т. Лаціса і Журомскага, райкаапсаюзам і ракалгасаюзам, пад адказнасьць іх старшынь ужыць самыя рашучыя захады да прасоўваньня уборачных машын у саўгасы і калгасы і рэалізацыі іх не пазьней 1 ліпеня.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства зараз-жа праверыць арганізацыю і ход рамонту уборачных машын і інвэнтару, устанавіўшы падэкадную саправаздачу аб гэтым.

3. Абавязаць Белмэталёб'яднаньне, пад адказнасьць тав. Сакаленка і Дырэктара заводу «Чырвоны Мэталіст» тав. Сухаручкіна арганізаваць выраб бульбакапалак з такім разьлікам, каб у чэрвені м-цы выпусьціць ня менш 300 штук, а на працягу 3-га квартала ня менш 1.700 штук за лік пераносу намечанага па пляну на 4 квартал—1.000 штук на 3 квартал, адначасова забясьпечыўшы поўнае выкананьне праграмы вырабу і здачы запасных частак для рамонту.

4. Прапанаваць Белкалгасцэнтру і саўгасаб'яднаньням не пазьней 20 чэрвеня скласьці канкрэтныя пляны арганізацыі рабочае сілы, разгарнуўшы шырока работу па заключэньню дагавароў на ўзаемадапамогу паміж саўгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі. Распрацаваць і дасласць саўгасам і калгасам нормы выпрацоўкі па ўсім уборачным работам і асобным культурам, забясьпечыўшы складаньне саўгасамі і калгасамі канкрэтных плянаў работ для кожнай брыгады паасобку.

5. Абавязаць саўгасаб'яднаньні і Белкалгасцэнтр, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў, не пазьней 20 чэрвеня выкананць дырэктывы СНК БССР і НКЗ СССР аб стварэньні прэміяльных фондаў за лепшае правядзеньне догляду за пасевамі і ўборкі, даўшы саўгасам і калгасам канкрэтныя паказаньні з тым, каб забясьпечыць ударныя тэмпы працы па ўборцы, разгарнуўшы назакол гэтага шырокую арганізацыйна-масавую работу.

6. Прапанаваць саўгасаб'яднаньні, Белкалгасцэнтру, Белкаапсаюзу і Белплодагародніне, пад адказнасьць кіраўнікоў гэтых устаноў, зараз-жа распачаць будаўніцтва навальнікоў—насеньня, бульбы і гародніны з тым, каб усё будаўніцтва было скончана не пазьней 1 кастрычніка.

7. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, саўгасаб'яднаньням, Белкалгасцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам:

а) ужыць самыя рашучыя захады да поўнага выкананьня пляну засеву сіласных культур;

б) неадкладна распачаць будаўніцтва сілосных траншэй ,ям і вежаў адначасова ужыўшы адпаведныя захады да рамонту траншэй і ям мінулага году.

Абавязаць Белмэталёб'яднаньне, пад адказнасьць тав. Сакаленка і Лесбел, пад адказнасьць тав. Міленькага забясьпечыць выпуск і поўную адгрузку сіласарэзак і сіласных веж па плянах і ў тэрмны, устаноўленыя СНК.

8. Абавязаць Белкаапсаюз, пад адказнасьць тав. Хасіна не пазьней 20 чэрвеня скласьці апэрацыйныя пляны ўборкі ўраджаю прыгарадных гаспадарак, прадугледзіўшы па ўзгадненьні з ЦСПСБ адпаведныя мерапрыемствы па прыцягненьню да ўборкі рабочых, служачых і членаў іх сямей.

9. Даручыць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі устанавіць сталы нагляд за выкананьнем гэтай пастановы.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **А. Калнін.**

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **Я. Элькін.**

10 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Яшчэ больш узмацніць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

На пасяджэньні Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй

МАСКВА, 15. На днях адбылося чарговае пасяджэньне прэзыдыуму Савету нацыянальнасьцяй Саюзу ССР пад старшынством тав. **Хацкевіча.** На абвестцы дню стаялі даклады Саюзнага ВСНГ і ВСНГ РСФСР аб выканальні пяцігадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці ў савецкіх саюзных і аўтаномных рэспубліках. За кароткі тэрмін мы маем баявыя тэмпы разьвіцьця прамысловасьці адсталых раёнаў нашага Саюзу. За 3½ гады пя БССР, ЗССР, ТУРКССР, УЗБССР, ТАДЖЫК ССР капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць складалі 917,36 млн. руб. або 59,1 проц. усяе сумы (1926-27 г.), зацраектаваных пяцігадовым плянам, а з вучотам вынясьня коштаў будаўніцтва—67,4 проц.

Па пляну ГОЭЛРО лічба 30 р ённых станцый, якія меркавалася пабудаваць на працягу 10-15 год магутнасьцю 1,5 мільёнаў кілёват, павінна была ўваходзіць па нацраёнах 400 тысяч кілёват. Фактыкна-ж да канца пяцігодкі мы будзем мець у нацрэспубліках эксплёатацыі ўжо каля 550 тысяч кілёват толькі па раённых станцыях, ня лічачы значна больш магутных прамысловых і мясцовых станцый. Усе гэтыя дасягненьні зьяўляюцца лепшым найбольш навочным паказчыкам правільнасьці нацыянальнай палітыкі савецкай улады і пасьпяховага выкананьня пяцігадовага пляну. Ня гледзячы на значныя посьпехі ў справе індустрыялізацыі нацыянальных рэспублік, вынікі маглі-б быць яшчэ больш значнымі калі-б ВСНГ СССР і Дзяржплян падыйшлі з адпаведнай увагай да выкананьня дырэктыў XVI зьезду партыі.

З боку ВСНГ СССР і РСФСР наглядаюцца яшчэ пяўважлівыя адносіны да асобных раёнаў. ВСНГ СССР і РСФСР, а таксама і самі саюзныя і аўтаномныя нацрэспублікі і вобласьці ня прынялі яшчэ належных мер да падрыхтоўкі нацыянальных камандных прамкадраў і асабліва да ўцягненьня карэннага насельніцтва ў прамысловасьць. Ва Ўзьбекістане рабочыя карэннай нацыянальнасьці складаюць толькі 31 проц. прамысловых рабочых і то нізкай кваліфікацыі. Да падрыхтоўкі нацыянальных пралетарскіх кадраў ВСНГ СССР трэба падыйсьці з усёй сур'ёзнасьцю. Са свайго боку нацыянальныя рэспублікі і вобласьці павінны больш праяўляць ініцыятыву ў справе падрыхтоўкі кадраў. ВСНГ СССР і РСФСР трэба паставіць перад сабой задачу 100 процантнага падвышэньня дырэктыў ураду і партыі ў адносінах індустрыялізацыі нацыянальных рэспублік. Трэба дабіцца сапраўднай праверкі рашэньняў, якія былі ўжо прыняты.

Для выпрацоўкі праекту рэзалюцый па дакладах ВСНГ абрана спэцыяльная камісія.

Баявому органу КП(б)У—газэце „Камуніст"

У сувязі з пяцігодзьдзем украінізацыі ЦО КП(б)У газэты «КАМУНІСТ», якое сёньня слаўняецца, рэдакцыя газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», паслала рэдакцыі «Камуніст» наступную тэлеграму:

Харкаў, Рэдакцыі газэты „Камуніст"

Баявому органу ЦК КП(б)Б шлем гарачае бальшавіцкае прывітаньне. Пяцігодзьдзе ўкраінізацыі «КАМУНІСТА» зьяўляецца ўрачыстасьцю ленінскай нацпалітыкі, юбілеем буйнейшай перамогі нашае партыі.

«КАМУНІСТ» паказаў бліскучыя ўзоры непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць апартунізму, вялікадзяржаўнага шавінізму, галоўнай небясьпекі на даным этапе, і контрэвалюцыйнага украінскага нацыянал-дэмакратызму. У барацьбе за сацыялізм, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады «Камуніст» ідзе, мы ўпэўнены і надалей будзе ісьці, ў першых радох бальшавіцкага друку.

Разьвіцьцё эканамічных адносін паміж СССР і Італіяй

З гутаркі гандлёвага прадстаўніка СССР у Італіі тав. М. М. Левінсона з прадстаўніком ТАСС

У сувязі з вашым пытаньнем аб нашых эканамічных узаемаадносінах з Італіяй, я з задаваленьнем магу канстатаваць што яны разьвіваюцца вельмі спрыяюча для абодвых бакоў.

Зусім іншая сыстэма гандлёвага гаспадарчай структуры ад іншых краін не перашкаджала і не перашкаджае ім устанавіць вельмі шчыльныя эканамічныя адносіны. Гэта ілюструецца лічбамі аб абсалютным і адносным росьце гандлёвага абароту за апошнія гады паміж абедзьвюма краінамі. Так, напрыклад, наш тавараазварот з Італіяй складаў:

1927-28 г.—13 млн. руб.—100 проц.
1928-29 г.—42 млн. руб.—128 проц.
1929-30 г.—74 млн. руб.—224 проц.

Індустрыялізуючыся, будуючы новыя фабрыкі і заводы і калектывізуючы нашу сельскую гаспадарку, мы атрымалі магчымасьць выкарыстаць італьянскую прамысловую прадукцыю ў шырокіх разьмерах і забясьпечваць Італію радам першаступнёвай важнасьці сельска-гаспадарчых і сыравных тавараў. Згода ад 2 жніўня 1930 году, рэалізаваная да тэрміну, і заключаная 27 красавіка 1931 году на больш шырокай аснове новая згода аб крэдытных гарантыях — зьяўляюцца яркім доказам фактычнага росту і разьвіцьця эканамічных адносін паміж абедзьвюма краінамі і важнейшай прадпасылкай для разьвіцьця іх у будучыні. Гэтаму павінна асабліва спрыяць хутчэйшае вырашэньне праблемы рэальнага фінансаваньня італьянскай вонкавай прамысловасьці італьянскімі банкамі. Лічу патрэбным адзначыць, што ня толькі тавараазварот характэрызуе нашы эканамічныя адносіны з Італіяй. Я маю на ўвазе шырокае выкарыстаньне намі італьянскага гандлёвага флёту. У мінулым 1929-30 годзе напрыклад, мы зафрахтавалі італьянскіх суднаў на 80 мільёнаў лір, а ў бягучым годзе гэтая сума, як відаць яшчэ больш павялічыцца. Гэтаму дапамагае далейшае разьвіцьцё тавараазвароту і зручнасьць шляхоў зносін.

Далей мы ўжо маем дагавары з буйнейшымі італьянскімі фірмамі адносна тэх—дапамогі па будаўніцтву заводаў (напрыклад, шарыкападшыпнікі, падвесныя дарогі) і ёсьць пэрспэктывы для далейшага прыцягненьня італьянскай тэхнікі і ў іншыя галіны. Характэрнай рысай нашых эканамічных адносін з Італіяй зьяўляецца таксама тое, што італьянская прэса і італьянская грамадзкая думка адразу зразумелі сутнасьць усіх паклёпніцкіх кампаній аб «савецкім дэмпінгу», якія ў адзін час узмоцнена вяліся супроць нашага экспарту ў некаторых краінах. Вуснамі галоўнейшых палітычных дзеячоў Італіі было заяўлена, што аб так званым «савецкім дэмпінгу» больш за ўсё крычаць тыя краіны,—як ПАЗШ і іншыя—якія ўжо на працягу шмат якіх год практыкуюць дэмпінг ў адносінах да Італіі.

Наш экспарт ў Італію складаецца з такіх тавараў, якія максымальна адказваюць інтарэсам Італіі. Ня кажучы ўжо аб нашым хлебе, які даўно зарэкамендаваў сябе ў Італіі, мы цяпер дастаўляем па прамысловасьці: нафту, лес, бавоўну, вугаль і інш. з вялікай выгодай для спажыўцоў.

Закончваючы, я жадаў-бы адзначыць, што мы маем усе асноўныя фактары для спрыяючага разьвіцьця эканамічных адносін паміж СССР і Італіяй.

Шчырае прызнаньне Зэвэрынга

Зэвэрынг у сваёй прамове оказаў: «Выконвайце доўг, калі вас нават лаюць. Калі вы маленькія крывавыя сабакі, дык я галоўны крывавы сабака. Ніякай літасьці. Ведайце самі калі вам трэба карыстацца сур'ёзнейшымі сродкамі. Мы яшчэ доўга будзем мець справу з падобным цижём палажэньнем». (З газэт).

МАЛ. М. АСОТА.

Зьезд прускіх жандараў

Каты патрабуюць „выдачы" т. Бужынскага

Паліцэйскі тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых узмацняецца

ВАРШАВА. Пракуратура зьвярнулася да маршала сойму з патрабаваньнем выдаць суду камуністычнага дэпутата Бужынскага. Патрабаваньне выдачы Бужынскага матывуецца тым, што Бужынскі быў актыўным удзельнікам апошняй трамвайнай забастоўкі і падбухторваў натоўп да нападу на трамваі, якія абслугоўваліся штрэйкбрэхерамі.

ВАРШАВА. У Лодзі закрыт і апячатан паліцыяй левы прафсаюз трамвайшчыкаў. Гэты саюз зьяўляецца ўжо 7-м прафсаюзам, закрытым уладамі за апошнія тыдні.

* * *

ВАРШАВА, 15. Закончылася «вясная гульня», якая адбывалася ў Вільні пад кіраўніцтвам Пілсудзкага. Пілсудзкі сёньня вярнуўся ў Варшаву.

Забастоўка пітсбурскіх гарнякоў разрастаецца

НЬЮ-ЁРК, 11-VI. 20.000 гарнякоў Пітсбургу (штат Пэнсыльванія) у суседнім раёне ўсходняй Агайо абвясьцілі забастоўку патрабуючы падвышэньня зарплаты.

Гарняжы арганізавалі на ўсіх капальнях пікеты, якія разьвіваюць энэргічную работу ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, штодзень адбываюцца сутычкі паміж пікетамі і паліцыяй. Паранена 6 гарнякоў. Многія рабочыя люта зьбіты паліцыяй, некалькі паліцэйскіх атрымалі параненьні. Рэвалюцыйны саюз гарнякоў патрабуе падвышэньня зарплаты, увядзеньня 8-гадзіннага рабочага дню, прызнаньня шахтавых камітэтаў.

Прафбюракраты з рэфармісцкага прафсаюзу, якія далучыліся да амэрыканскай фэдэрацыі працы, дарэмна спрабавалі падначаліць забастоўку свайму кантролю і спыніць работу пікетаў.

Даш прамысловасьці



Усе тэрміны сяўбы лёну і канапель канчаюцца. Далейшае адцягненьне—правал заданьня партыі і ўраду

Асьвейскі, Бешанковіцкі, Сеньненскі і Копыскі раёны ставяць пад пагрозу выкананьне плянавых заданьняў засева лёну

Патрэбен тэрміновы і рашучы пералом

Усякія тэрміны скончэньня веснавой сяўбы наогул і сяўбы тэхнічных культур у прыватнасьці зусім ужо праходзяць і таму марудзяць надалей з выкананьнем пасеўных плянаў зараз проста ўжо немагчыма, недапушчальна, злачынна, бо надыходзіць такі час, пасьля якога сяўба, калі яна нават будзе і праведзена, ня можа вытрымаць ніякай крытыкі з пункту гледжаньня мінімальных запатрабаваньняў агранаміі.

І аднак, не зважаючы на гэта, цэлы рад раёнаў усё яшчэ не пераключылі ся на ўдарныя тэмпы работы і па бальшавіцку не ўзяліся за скончэньне сяўбы тэхнічных, што сьцьвярджае пастанова Калгасцэнтру якую сёньня мы друкуем.

48,6 проц. выкананьня пляну па Асьвейскім раёне, 40 проц. па Бешанковіцкім, 58 па Сеньненскім і 56 па Капыскім становяць сабой такі значны прарыў з сяўбой тэхнічных у гэтых раёнах, якому проста нельга знайсьці адпаведнай кваліфікацыі, на толькі злачынны і недапушчальны ён!

Партыйна - камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі гэтых раёнаў, актыў пралетарскай грамадзкасьці іх, адпаведныя ўстановы і да гэтага часу не зразумелі відаць таго, што надыходзіць, і па сутнасьці надыйшоў ужо час непасрэднай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, і таму не сьпяшаюцца са канчэньнем пасеўнай.

Само сабой зразумела, што правядзеньне апошняй ў той час, калі яна павінна была-б быць ужо скончана, пэўным чынам пакладзе свой адбітак і на падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі—асабліва ў **дачыненьні тэхнічных культур.**

А між тым, стоячы перад неабходнасьцю тэрмінованага скончэньня сяўбы адзначаныя раёны натуральна ня могуць ужо і зараз займацца гэтымі пытаньнямі і таму несваячасовае скончэньне аднэй кампаніі можа павесьці за сабой ня сталую і не дастатковую падрыхтоўку да другой ніколькі ня менш, а нават больш важнай, з пункту гледжаньня асноўных працэсаў яе, гаспадарчай кампаніі, а менавіта—да ўборачнай кампаніі.

Вось чаму нескончэньне сяўбы да гэтага часу мае такое важнае значэньне і пагражае цэлым колам прарыву ў далейшай рабоце па рэалізацыі ўраджаю тэхкультур гэтага году.

Вось чаму памянёным раёнам неабходна нарэшце зразумець усю недапушчальнасьць тэмпаў у правядзеньні сяўбы і, шляхам пераключэньня на сапраўды баявыя бальшавіцкія ўдарныя тэмпы, справу з мёртвага пункту тэрмінова зрушыць.

А. С.

Аб ходзе сяўбы лёну па калгасах БССР

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР

Заслухаўшы інфармацыю Пасеўбюро аб ходзе сяўбы лёну, канстатаваць нездавальняючы ход сяўбы (плян сяўбы лёну па калгасах на 10-VI выканан на 88 проц).

Асобныя раёны, дзякуючы сапраўдна бальшавіцкай барацьбе за лён, плян сяўбы лёну на 10-VI (выходзячы з процанту калектывізацыі бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак) скончылі з перавышэньнем, як-то: Халопеніцкі—116,9% пляну, Высачанскі—112,3 проц., Ветрынскі—121 проц. і Расонскі—108%.

Разам з гэтым значная частка раёнаў адстаюць з пасевам і выкананьне плянаў сяўбы паставілі пад пагрозу зрыву. Асабліва ганебна адстаюць з сяўбою лёну раёны: Асьвейскі (выканаўшы плян на 48,6 проц.), Бешанковіцкі (40 проц.), Сененскі (58 проц.) і Копыскі (56 проц.).

Праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляе:

1. За своячасовае скончэньне з перавыкананьнем пляну сяўбы лёну Халопеніцкі і Высачанскі Калгассаюзы прэміраваць па 3000 р. кожны на падрыхтоўку кадраў брыгадзіраў з калгасьнікаў па ўборцы і пераапрацоўцы лёну Ветрынскі і Расонскі Калгассаюзы за перавыкананьне пляну сяўбы лёну—за несьці на чырвоную дошку.

2. Прапанаваць Халопеніцкаму, Высачанскаму, Ветрынскаму і Расонскаму Калгассаюзам да 25-VI прадставіць Калгасцэнтру калгасы, своячасова скончыўшыя і перавыканаўшыя плян сяўбы, на аснове правільнай арганізацыі працы, для прэміраваньня.

3. За недапушчальна марудны ход сяўбы, праяўленую бязьдзейнасьць і зрыў пляну сяўбы лёну ва ўстаноўленыя тэрмін, старшыню Асьвейскага Калгассаюзу тав. **Жыгунова** і старшыню Бешанковіцкага Калгассаюзу тав. **Красько** з працы зьняць. Папярэдзіць старшынь Калгассаюзаў Борковіцкага, Сеньненскага і Копыскага, што, калі плян поўнасьцю ня будзе выканан, пытаньне будзе пастаўлена аб працаздольнасьці гэтых Калгассаюзаў.

4. Прапанаваць усім Калгассаюзам, ня выканаўшым плян сяўбы лёну на 10-VI, поўнасьцю выканаць на працягу 3-5-ці дзён. Абавязаць Калгассаюзы безадкладна арганізаваць дапамогу адстаўшым калгасам з пасевам лёну, з боку лепшых калгасаў, скончыўшых і выканаўшых плян сяўбы.

Старшыня Калгасцэнтру
С. МІЦЬКОЎ.
Сакратар МІРОНАЎ.
14 чэрвеня 1931г.

МЕСЯЧНЫ ЗАРАБОТАК ПАЗЫЧЫМ ДЗЯРЖАВЕ

Датэрмінова рэалізуем пазыку „Трэцяга рашаючага"

Хваля падпіскі ахапляе новыя і новыя прадпрыемствы

МАГІЛЕЎ. (БЕЛТА). Дэкрэт аб выпуску пазыкі «3-га рашаючага» прадоўжыны Магілеўшчыны сустрэлі з адзадушным адабрэньнем. На прадпрыемствах пырока разгортваецца падпіска на пазыку. За адзін дзень рабочыя будзканторы падпісаліся на 8.000 руб. 47 рабочых хлебазаводу падпісаліся—на 5.000 руб. Менш месячнага заробку ніхто з рабочых не падпісваецца.

Вучні 14-й школы падпісаліся на 1200 руб., настаўнікі—на месячны заробак.

Папярэдняя падпіска на пазыку ў калгасах Вендароскага сельсавету дала 5.000 руб. Хвалій падпіскі ахопленыя дзесяткі новых калгасаў.

Пазыка на прадпрыемствах Віцебску

Віцебск, 14-VI. (па тэлефону ад наш. кар.). 14-га чэрвеня ў г. Віцебску адбылася дэманстрацыя рабочых, служачых і студэнтаў прысьвечаная да выпуску пазыкі «3-га рашаючага». На мітынгу рабочыя буйных прадпрыемстваў і студэнты рапартавалі аб пасьпяховым ходзе папярэдняй падпіскі на новую пазыку.

На шэйнай фабрыцы «Сьцяг Індустрыялізацыі» на сёньняшні дзень ахоплена падпіскай 80 проц. усіх рабочых. На ўсіх прадпрыемствах праведзены мітынгі, на якіх рабочыя віталі выпуск новай пазыкі.

Рабочыя Віцебску абязуюцца ў дэкады тэрмін скончыць папярэднюю падпіску, ахапіўшы ёю 100 проц. рабочых і служачых.

14 чэрвеня пачаўся ўнечарговы пленум Гарсавету і Гарпрофсавету па пытаньні аб рэалізацыі новай пазыкі і выклику Менгарсавету і Гарпрофсавету на сацпаборніцтва на правядзеньне рэалізацыі новай пазыкі.

Дварсон.

Пралетарыят Гомлю з вялікім энтузіязмам па-ўдарнаму рэалізуе пазыку

Гомель, 14-VI. (Белта). Падпіска на пазыку «3-га рашаючага» разгортваецца ці на горадзе пры вялізарнейшым энтузіязьме працоўных мас. Амаль ўсюды рабочыя падпісваюцца на месячны заработак. За першыя тры дні падпіскі на асноўных прадпрыемствах Гомлю высунуты сустрэчныя пляны. Па заводзе Сельмаш за гэтыя дні заданьне выканана на 32 проц., па майстэрнях Жылсаюзу—на 78 проц.

Гарпрафсавет прапанаў ФЗМКомам і шэфарганізацыям перавесьці рэалізацыю пазыкі на рэйкі сацспаборніцтва, ствараючы скразныя буксірныя брыгады і зараз-жа разгарнуць работу па рэалізацыі пазыкі ў падшэфных калгасах і вёсках.

Вялікую работу праводзіць заводзкі друк. Члены рэдкалегіі шматтыражкі «Голас краўца», падпісаўшыся на пазыку на месячны заработак, выклікалі ўсе рэдкалегіі шматтыражак пасьледаваць іх прыкладу. Газэта. «Цягнік сацыялізму» выпускае штодзённы бюлецень у якім асьвятляе ход рэалізацыі пазыкі. «Палеская Праўда» штодня выпушчае прысьвечаную пазыцы ілюстраваную насьценгазэту, якая вывешваецца ў цэнтры гораду.

Пасьледуйце нашаму прыкладу

(ст. Пціч Зах. чыг.).

Праўленьне і ўвесь тэхнічны пэрсанал арцелі «Лесаб'яднаньне», петрыкаўскага «Райкаапрамсаюзу» датэрмінова падпісваецца на пазыку «3-га рашаючага» на 100 проц. месячнага заработку і выклікае пасьледаваць свайму прыкладу: Петрыкаўскі Райкаапрамсаюз, Пціцкую Лесагэмічную арцель «Нова Пціч», Калінкавіцкую арцель «Ясень», Ельскі Райкаапрамсаюз і арцель «Чырвоны Кастрыч

Работу каапэрацыі—на новыя рэйкі

Выкананьне агульна - гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуе максымальнага разгартваньня сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі.

Выключная роля выпадае ў гэтым пасьпяховым разгортваньні—на долю каапэрацыі. Пераможнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты надзвычайна павялічыла ўдзельную вагу каапэрацыі ў таваравароце, зрабіла яе мажапалістам на рынку.

Аднак, тэмпы перабудовы каапэрацыі надзвычайна адсталі ад тэмпаў сацыялістычнай рэконструкцыі. У працы каапэрацыі выявіўся шэраг буйнейшых недахопаў, — бюракратызм, непаваротлівасьць, якія прыводзілі да штучнага затазвараньня пры наяўнасьці тавараў на складах, базах і г. д.

Гаспадарчы разрахунак быў запомнены, некаторыя арганізацыі замест усямернага пашырэньня савецкага гандлю памылкова захапіліся непасрэдным пераходам да сацыялістычнага прадукта-абмена, не зварочвалі ўвагі на рэнтабельнасьць справы, цяр пелі страты пры продажы тавараў, не заўважваючы калькуляцыю цэн.

Гэтыя прычыны цесна ўвязваліся з нагаршэньнем абслугоўваньня спажыўца, парушэньнем выбарнасьці ў нізавых зьвеньнях каапэрацыі.

Газэта «Савецкая Беларусь» і Менгарсавет арганізавалі рэйд—праверку таго, як каапэрацыйныя арганізацыі, гандлёва-каапэрацыйная сэкцыя гарсавету і дэпутацкія групы на прадпрыемствах вядуць работу па перабудове работы каапэрацыі.

Рэйд выявіў цэлы рад фактаў, якія сьведчаць аб тым, што работа па перабудове органаў каапэрацыі ідзе марудными тэмпамі, што пастанова ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу не атрымала яшчэ канкрэтнага і практычнага вырашэньня ў гэтых арганізацыях. Перабудова ідзе вельмі марудна. Рэйд сыгналізуе аб тым, што трэба зараз-жа па-баявому ўзяцца за гэтую перабудову, што трэба мабілізаваць масы рабочых і працоўных на выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

Адставаньне тэмпаў пераходу каапэрацыі на рэйкі рэканструкцыйнага пэрыяду—ня можа быць цярпімым. Камуністычная партыя ў рашэньнях сваіх вышэйшых органаў катэгарычна патрабавала ад каапэрацыі перабудовы сваёй працы. Аб гэтым гаворыць адозва ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу, а таксама пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб перабудове спажывецкай каапэрацыі БССР.

Каапэрацыйная сыстэма БССР ў выкананьні рашэньняў вышэйшых органаў партыі на працягу апошніх месяцаў вядзе працу па перабудове органаў каапэрацыі. Арганізаваны раённыя саюзы, якія аб'яднаюць выбарныя сельскія спажывецкія Т-вы; вылучаны ЗРК на буйнейшых прадпрыемствах; палепшаецца праца зачыненых разьмеркавальнікаў, рабочых сталовак і г. д., дзякуючы павышэньню работы рабочага кантролю.

Вялікая праца праароблена каапэрацыяй БССР ў справе арганізацыі пры гарадных гаспадарак; якія займаюць дзесяткі тысяч га. Праведзена сяўба гарадзкіх культур на плошчы каля 6000 га, ўтвораны малочныя фэрмы, адкормачныя пункты і г. д. Гэтая праца патрабуе свайго далейшага паглыбленьня на грунце гаспадарчага разрахунку, дасканалай калькуляцыі, плянавасьці, суровай фінансавай дысцыпліны. Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб працы Спажывецкай Каапэрацыі, Белкаапсаюз перабудоўваецца па прыкладу ВСНГ. Арганізаван Прэзыдыум, а таксама выдзяляюцца наступныя аб'яднаньні:

На гандлю скуратварамі, абутку, галёшамі і шорнымі таварамі.

На ганд. гатовай вопраткай, тэкстылем, галаўнымі ўборамі і пушнатаварамі.

На галянтарэі і трыкатажу.

На гандлі мэбляй і дровамі.

На гандлі сылікатамі і жалеза-скобянымі таварамі.

На гандлі культ. таварамі

На гандлі бакалейна-гастранаміч. і кандытарск. таварамі.

На дзіцячаму забясьпечаньню.

Рэарганізавана справа загатовак, дзе арганізаваны таксама спэцыяльныя аб'яднаньні па плода-гароднінне, утылю, малочна-масьляных і яечных прадуктаў. На гаспадарчы разрахунак пераведзены і іншыя віды загатовак.

Для вядзеньня вытворчай дзейнасьці арганізаваны аб'яднаньні Белкаапрамхлеб і аб'яднаньне прыгарадных гаспадарак. Для палепшаньня справы грамадзкага харчаваньня арганізуецца самастойная сэкцыя па грамадзкім харчаваньні са сваім паявым капіталам, а для палепшаньня абслугоўваньня рабочых торфараспрацовак і рабочых сплаву і лесазагатовак,—арганізаваны самастойныя сэкцыі—тарфяныя і лясныя.

Гэтыя аб'яднаньні і Сэкцыі ўжо пачалі сваю дзейнасьць і прымаюць адпаведныя магазыны і прадпрыемствы ад ЦРК.

Апэрацыйныя функцыі ад самага Белкаапсаюзу пераходзяць да арганізаваных аб'яднаньняў, а цэнтр цяжару працы самаго Белкаапсаюзу павінен быць перанесен на плянаваньне і рэгуляваньне, на пастаноўку вучоту працы і кантроль над працай аб'яднаньняў і арганізацый сыстэмы спаж. каапэрацыі.

Гэтая арганізацыйная перабудова павінна даць спэцыялізацыю ў гандлі асобнымі відамі і тавараў, лепшую працу магазынаў і прадпрыемстваў, лепшае абслугоўваньне пайніка. Грун там дзейнасьці аб'яднаньняў, іх прадпрыемстваў і магазынаў зьяўляецца гаспадарчы разрахунак. Асноўным зьвяном гандлёвай дзейнасьці павінен быць магазын, маючы свой прамфінплян.

У мэтах далейшага разгортваньня каапэрацыйнага гандлю, ў асаблівасьці на прадуктах харчаваньня, Белкаапсаюзам зацьверджан плян разгортваньня новых магазынаў, які будзе ажыцьцёўлены да 1-га верасьня.

Рашаючым пытаньнем зьяўляецца паскарэньне таваразвароту. У гэтых мэтах адменена практыка нармаваньня і браніраваньня продажу прамтавараў, дзе робяцца выключэньні для асобных відаў дэфіцытных промтавараў і снабжэньня асабліва-важных работ. Але і тут тэрмін хаваньня гэтых тавараў абмяжован невялікім часам.

Цікава адзначыць, што ў выніку выкананьня рашэньня партыйных і ўрадавых органаў, астаткі тавараў па сыстэме спажывецкай каапэрацыі БССР значна скарацілася: з 28 мільёнаў на 1 красавіка да 22 млн. на 1 мая і ў маі ішло далейшае скарачэньне астаткаў тавараў.

Пасьпяховае завяршэньне гэтае рэарганізацыі патрабуе адпаведнай перабудовы працы партыйнага і прафсаюзнага апарату і каапэрацыйных арганізацыях, максымальнай мабілізацыі ўвагі рабочых мас да працы каапэрацыі, пасіленьне рабочага кантролю, а таксама ў першую чаргу рашучай перабудовы працы Саюзу каапэрацыйных і гандлёвых працаўнікоў у справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, укараненьня перадавых мэтадаў камуністычнай працы.

Гэтакім чынам, перад спажывецкай каапэрацыяй стаяць надзвычайнай важнасьці і складанасьці задачы—дасягнуць тэмпаў, адпавядаючых тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва і пры сапраўдным ажыцьцяўленьні адозвы ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу і ЦК КП(б)Б і СНК БССР. Пры належнай ўвазе ўсіх арганізацый, да якіх адрасавана гэтая адозва, справе перабудовы працы каапэрацыі, пры пасіленьні рабочага кантролю—гэтыя адказнейшыя задачы будуць выкананы.

Стракоўскі.

Ход перабудовы каапэрацыі не адпавядае бальшавіцкім тэмпам

Дэпутацкія групы яшчэ ня сталі ў першых радох барацьбітоў за бальшавіцкую работу спажывецкай каапэрацыі

Рэйд выявіў, што на заводах „БАЛЬШАВІК", „КАМУНАР" і імя ВАРАШЫЛАВА тэмпы перабудовы не забясьпечваюць сваячасовага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб спажыўкаапэрацыі.

УСЕ НЕДАХОПЫ, ВЫКРЫТЫЯ РЭЙДАМ, ПАВІННЫ БЫЦЬ НЕАДКЛАДНА ЗЬНІШЧАНЫ, ПРАПАНОВЫ—АЖЫЦЬЦЁЎЛЕНЫ

Апартуністычная неадацэнка работы дэпутацкіх груп

(Друкарня імя т. Сталіна).

У друкарні імя Сталіна маецца 8 членаў Гарсавету, 3 кандыдаты і каля 50 чалавек іншага савецкага актыву.

Гэты актыў рабочых-ударнікаў, пры адпаведнай пастаноўцы работы змогбы аказаць вялікую дапамогу прадпрыемству ў выкананьні стаячых перад ім задач, але, як адміністрацыя, так і фабком не прынялі ніякіх мер да выкананьня пастаноў гаркому партыі і гарсавету аб арганізацыі гэтага актыву ў дэпутацкую групу і наладжваньні яе работы.

Каб ня быць галаслоўным падамо факты. Гарсавет ужо 3 разы прысылаў у **друкарню імя Сталіна** грамадзкіх інструктароў для дапамогі ў справе арганізацыі дэпутацкай групы і выпрацоўкі пляну яе работы, але, дзякуючы нядбайным адносінам да гэтае справы фабкому, жаданьні інструктароў засталіся толькі добрым намерам.

4 чэрвеня адказны сакратар фабкому **т. Вінік** аднаму з гэтых інструктароў нагаварыла цэлыя горы цяжкасьцяй і прычын немагчымасьці склікаць актыў друкарні для абгаварэньня пытаньня арганізацыі дэпутацкай групы, а нарэшце ўсё-ж згадзілася прыняць за хады да вырашэньня гэтага пытаньня. Аднак, калі 5 чэрвеня адзін з грамадзкіх інструктароў па тэлефоне зьвярнуўся да **т. Вінік** з просьбаю вызначыць дзень скліканьня актыву, дык **т. Вінік** адказала, што «ў друкарні да 11 чэрвеня ўсе дні заняты іншай работай і склікаць савецкі актыў да паказанага тэрміну немагчыма».

Зусім зразумела, што пры такім стаўленьні нельга гаварыць ня толькі аб удзеле дэпутацкай групы ў перабудове каапэрацыі, а нават наогул аб якой-небудзь работе з дэпутатамі і савецкім актывам.

Такія адносіны да выкананьня пастаноў гаркому партыі і Гарсавету зьяўляецца ні чым іншым, як апартуністычнай недаацэнкай рашэньняў партыі і ўраду аб рабоце дэпутацкіх груп.

Кіруючыя арганізацыі друкарні павінны на такія адносіны да важнейшай справы наладжваньня савецкай работы на прадпрыемствах адпаведным чынам рэагаваць і прымусіць фабком у хутчэйшы час выканаць свае абавязкі.

М. Б.

Тут ня ўсё яшчэ добра

На завод імя Варашылава наша брыгада зьявілася незадоўга да абедзенага перапынку. У заводзкай сталоўцы ўжо праводзілася клапатлівая падрыхтоўка да абеда. На сталох расстаўлялі пасуду, раскладалі хлеб, адначасова расстаўлялися і стравы.

Абед пачаўся адразу пасьля гудка на перапынак. Уваходзячы ў сталоўку рабочыя аддавалі кантралёру свае талёны, набытыя ў пачатку месяца, і групамі па 12 чалавек садзіліся за стол, дзе ўжо было ўсё падрыхтавана да абеда.

Праз 10—15 хвілін частка сталоў ужо асвабадзілася. Іх зараз-жа ўбралі і накрылі для новых груп абедаючых. Тыя, хто паабедаў, выпускаліся праз дзьверы ў процілеглыя канцы сталоўкі.

Менш, чым праз паўгадзіны ўжо ўся зьмена паабедала.

Прапускная здольнасьць сталоўкі за воду імя Варашылава—1.500 у суткі. Сталоўка абслугоўвае ўсе тры зьмены рабочых. Частка работ мэханізавана: ёсьць бульбачыстка, хлебарэзка і інш., якія прыводзяцца ў рух электратокам. Брудная пасуда звозіцца на мыйку спэцыяльнай ваганэткай. Рацыяналізавана работа кухні, афіцыянткі і павары больш ня блытаюцца, з талёнамі. На кухні няма звычайнай штурханіны, а кожны ведае сваё месца і работу выконвае чотка і дасканала. Усё гэта значна паскорыла час абеду ,скарацілі яго да мінімуму. Работа па абслугоўваньні абедзеных сталоў вы конваецца 6-ю афіцыянткамі замест 15, як гэта было да рэарганізацыі работы сталоўкі.

Буфэт знаходзіцца асобна ў суседнім пакоі. Там рабочы атрымлівае гарбату і халодныя закускі.

Пры сталоўцы ёсьць свой сьвінагадоўчы пункт, дзе гадуюцца сьвіньні.

Такі самы малюнак убачылі мы і на заводзе «Камунар».

Зараз заводы імя Варашлыава і «Камунар» маюць свой заводзкі рабочы каапэратыў. Там выбарнае праўленьне, якое разам з заводзкімі каапкамісіямі разьмяркоўваюць тавары сярод рабочых. У каапэратыве ўстаноўлены дзяжурствы членаў каапкамісіі. У выніку гэтага каапэратыў амаль зусім ліквідаваў чаргі. Практыкаваліся і папярэднія заказы на прадукты.

Усё гэта дасягнута ў выніку ўпартай работы парткалектываў заводзкіх арганізацый над палепшаньнем работы каапэрацыйных устаноў.

Аднак, гэта работа яшчэ ня скончана і яшчэ патрабуе шмат чаго. Ня гледзячы на значнае палепшаньне арганізацыйнай работы каапэратыву і сталовак у рабоце гэтых арганізацый яшчэ ёсьць шмат недахопаў, якія трэба зьнішчыць.

На заводзе« Камунар» у апошні час пагоршала работа сталоўкі. Тав. **Шымес**, які зараз часова замяшчае заг. сталоўкі, мала цікавіцца работай апошняй. У выніку гэтага якасьць абедаў пры наяўнасьці тых-жа ўмоў зьніжаецца. Рыба для абедаў часта бывае недастаткова вымачана і г. д. Іншы раз спазьняюцца абеды з-за несваячасовай падвозкі дроў. Ня выконваюцца санітарныя правілы.

На сьвінаадкормачным пункце пры сталоўцы заводу імя Варашылава частка сьвіней недастаткова даглядаецца. У сьвінарніку брудна.

Ёсьць шмат недахопаў і ў рабоце ЗРК. Ня гледзячы на рэарганізацыю работы заводзкага разьмеркавальніка ў заводзкі рабочы каапэратыў, работа апошняга кульгае.

Апарат каапэратыву яшчэ недастаткова гібкі і недастаткова прыстасаваны да лепшага абслугоўваньня рабочых. Яшчэ недастаткова наладжана сувязь у рабоце праўленьня ЗРК і каапкамісіі заводу. Часта здараецца, што аб таварах, якія паступаюць у ЗРК, на заводзе ня ведаюць і потым тавар пры ходзіцца рэалізаваць з недастатковай плянавасьцю, а іншы раз нават бывае і так, што нерэалізаваны сваячасова тавар адсылаецца назад у Белкаапсаюз.

Асабліва гэта наглядаецца ў той краме, якая зараз абслугоўвае завод **«Камунар»**.

Паянжакапленьне і мабілізацыя сродкаў —гэта работа, якая павінна заўсёды быць у цэнтры ўвагі працаўнікоў каапэратыву часта змазваецца, дзякуючы непаваротлівасьці праўленьня. Былі выпадкі, калі некаторыя рабочыя **«Камунара»** прасілі праўленьне аб тым, каб ад іх узялі грошы як паявы аванс на зімовую вопратку, але праўленьне адмаўляла ім у гэтым, мятлываючы тым, што зараз прымаюцца аванс толькі на летнюю вопратку, а адносна зімовай «яшчэ няма адпаведных дырэктыў і таму невядома куды зьнікаваць гэтыя грошы».

Да гэтага часу яшчэ не заключаны так званы «тройственный» дагавор паміж праўленьнем ЗРК, фабкомам і адміністрацыяй заводаў. У той час, як шмат якіх каапэрацыйных арганізацый ня маюць у дастатковай колькасьці сродкаў для разгортваньня сваёй работы, ЗРК мэталістаў не скарыстоўвае значную частку сваіх сродкаў, якія ляжаць бяз руху. ЗРК даручана арганізаваць адзін кіёск сэльтэрскай вады, але на працягу больш месяца праўленцы ня здолелі яго адрамантаваць.

Усе гэтыя хібы ліквідаваць бязумоўна можна і патрэбна.

Трэба рашуча ўзмацніць рабочы кантроль над дзейнасьцю каапэратыву.Трэба ўзмацніць і сувязь праўленьня каапэратыву з заводзкімі каапкамісіямі. Плян работы каапэратыву павінны быць даведзены ня толькі да кожнай заводзкай каапкамісіі, але і да каапкамісіі кожнага цэху, да кожнага рабочага. Трэба лепш упарадкаваць дзяжурствы ў ЗРК.

У рабоце заводзкага рабочага каапэратыву Менскіх мэталістаў існуе яшчэ адна ненармальнасьць. Справа ў тым, што дзьве крамы, якія мае гэты магазын, пакуль што зьяўляюцца па сваёй сутнасьці як-бы асобнымі ўнівэрсальнымі магазынамі. Аб спэцыялізацыі гэтых крам на заводах «пагаварваюць», але практычна пакуль што мала робіцца. Завод імя Варашылава высоўвае гэтую прапанову, але на «Камунары» баяцца: «как бы чего не вышло»—будуць зноў чаргі, непаразкі і г. д.

Вопыт іншых заводаў, вопыт работы ЗРК у тых выпадках, калі тое ці іншае разьмеркаваньне тавараў праводзілася пры ўзаемнай узгодненасьці праўленьня ЗРК з каапкамісіямі паказаў, што належна паставіўшы гэтую сувязь, пры належным рабочым кантролю, можна пазбавіцца ад чаргі нават пры самай складанай рабоце па разьмеркаваньні.

Недапушчальным зьяўляецца і той факт, што на заводзе імя Варашылава лічаць, што калі работа ўнутрызаводзкіх каапэрацыйных арганізацый пастаўлена добра дык больш нам нічога ня трэба рабіць. Калі мы запыталіся ў старшыні заўкому **т. Давыдава** аб прапрацоўцы адозваў і пастаноў партыі і ўраду па перабудове работы каапэрацый і практычных мерапрыемстваў вынесеных па гэтым пытаньні, дык ён проста адрэзаў:

— У нас усё добра. (?).

А прыглядзецца—дык ўперадзе яшчэ шмат работы.

Дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове спажывецкай каапэрацыі на заводзе не прапрацаваны. Намячаліся сходы па абгаварэньні гэтага пытаньня, але яны зрываліся з-за адступнасьці дакладчыкаў.

На заводзе **«Камунар»** праўда адозва ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу СССР аб перабудове работы каапэрацыі прапрацавана, але заўком і заводзкія арганізацыі пасьля таго, як рэарганізавалі работу каапэрацыйных устаноў унутры заводзкага значэньня—супакоіліся і адыйшлі ад гэтай работы.

Усё гэта патрабуе ад рабочых арганізацый яшчэ шмат упартай і глыбокай работы па палепшаньні і ўдасканаленьні работы каапэрацый. **Асабліва вялікую ролю могуць адыграць дэпутацкія групы, якія зараз на заводах толькі пачынаюць разгортваць сваю дзейнасьць.**

Брыгада Менгарсавету і газ. «Сав. Бел.» Пакроўскі. Брыгада. Маркаў, **Эфраімская, Эрнфельд, Ладуцька, Тэйлес, Мінц, Зінкоўская, Клейнер.**

Дэпутацкую групу „Бальшавіка" на перадавую лінію перабудовы каапэрацыі

Перабудова работы спажывецкай каапэрацыі на аснове рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) СНК і Цэнтрасасюзу ёсьць важнейшая першачарговая задача усіх партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый на бліжэйшы перыяд. Хуткае і поўнае выкананьне вызначаных у гэтай адозьве канкрэтных мерапрыемстваў, радыкальнейшым чынам палепшыць абслугоўваньне рабочага спажыўца і ўзьніме каапэрацыю на вышэйшы тых задач, якія ўскладаюцца на каапэрацыю нашым разгорнутым сацбудаўніцтвам.

Але справіцца з гэтай задачай каапэрацыя зможа толькі пры самай актыўнай дапамозе ёй з боку партарганізацыі, савецкіх, прафсаюзных і іншых арганізацый, толькі пры той ўмове, калі на дапамогу каапэрацыі будзе ўзьнята ўся пралетарская грамадзкасьць.

Дэпутацкія групы, зьяўляючыся важнейшым зьвяном Гарсавету непасрэдна на вытворчасьці, маюць магчымасьць штодзень наглядаць за работай каапэрацыі, яны могуць і павінны аказаць значную дапамогу каапэрацыі ў справе ліквідацыі яе буйнейшых прарываў і палепшаньня яе работы.

На справе мы на сёньняшні дзень гэтага ня маем.

Рабочы калектыў заводу «Бальшавік», пад кіраўніцтвам партарганізацыі дае шмат бліскучых прыкладаў гераічнай барацьбы за прамфінплян, за выкананьне тых задач, якія пастаўлены перад ім партыяй і ўрадам. Выкананьню прамфінпляну па ўсіх яго паказьніках падпарадкавана ўся работа партыйнай, прафэсыянальнай і інш. арганізацый на заводзе.

Зараз на заводзе разгорнута вялікая работа па арганізацыі заводзкага рабочага каапэратыву. Работа вельмі адказная і складаная.

Аб гэтым каапэратыве старшыня заўкому т.Данішэўскі расказвае з вялікім захапленьнем. На яго (ЗРК) ўскладаецца рад адказнейшых задач. Заводзкі рабочы каапэратыў павінен зьявіцца яшчэ адным ударным цэхам заводу, ён павінен аказаць вялікую дапамогу ў барацьбе за тэмпы, за колькасьць і якасьць...

Дэпутацкая група, якая налічвае ў сваім складзе каля 60 чалавек, да 14 чэрвеня нават не абгаварыла адозвы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу. **У справе арганізацыі ЗРК дэпутацкая група ні**

У зачыненай сталоўцы (завод імя Варацылава).

Уключаюцца ў конкурс на лепшую дэпутацкую групу

Прадпрыемствы Віцебску **«Чырвоны Мэталіст», «Дзьвіна», «Сьцяг індустрыялізацыі»** і іншыя ўключыліся ў абвешчаны гореаветам конкурс на лепшае прадпрыемства і дэпутацкую групу.

Але большасьць прадпрыемстваў: **фанэрны завод, лесазавод, мэблевая фабрыка, голкавая, шчотачная, інструментальна-мэблевая і г. д. ня ўключыліся ў конкурс.** Гэта тлумачыцца тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў недаацэньваюць палітычнага значэньня конкурсу, які павінен мабілізаваць рабочую масу на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну і перабудову каапэрацыі.

Брыгада «Сав. Бел.»: Н. Дварсон і С. Міркін.

Месячнік лесавывазкі

Данбасу—руднічныя стойкі!

300 вагонаў стоек і аполкаў адгрузіць руднікам Данбасу

Лесбел адказвае за сваячасовую адгрузку

Не дапускаць перабояў

у забясьпечаньні Данбасу лесам

Паводле атрыманых ад Лесбелу вестак, выкананьне пляну адгрузкі рудничных стоек і аполкаў для Донбасу мае такі малюнак.

Заданьне першага кварталу (з 1-І па 1-VI—1931) у 2.077 вагонаў выканана цалкам і нават з перавышэньнем на 115 вагонаў, бо замест 2.077 па лініі Лесбелу адгружана 2.192 вагонаў.

Такое становішча дасягнута, бязумоўна, у выніку разуменьня мясцовым арганізацыямі і савецкай грамадзкасьцю важнасьці забясьпечаньня ўсесаюзнай качагаркі неабходнымі лесаматар'ялам, а таксама і ў выніку добрага арганізацыйнага і апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай справай з боку апарату Лесбелу і яго раённых кантор, перад якімі і надалей стаіць задача не паслабляць як тэмпаў падрыхтоўкі неабходных матарыялаў на мясцох, так і тэмпаў сваячасовай адпраўкі іх па прыналежнасьці.

Асаблівую ўвагу ў гэтым напрамку неабходна зьвярнуць на сваячасовае выкананьне другога кварталу, які ахапляе тэрмін з 1-IV па 1-VII—1931 г. і вызначаецца лічбаю ў 1.400 вагонаў.

Паводле вестак Лесбелу, у выкананьні яго маецца наступны малюнак: на 10-VI—31 г. адгружана **1.169 вагонаў. Данбасу лес!**

Такім чынам, за астатнія 2 дэкады кварталу (да 1-га ліпеня) неабходна ад грузіць яшчэ каля 300 вагонаў лесаматарыялаў па лініі Лесбелу.

Тэрмін канчаецца. Адпаведным раённым арганізацыям і ўстановам, мясцовым партыйна-камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям, а таксама і Лесбелу і яго канторам на мясцох неабходна фарсаваць загатоўку адпаведных матарыялаў, падвозку на станцыі і тэрміновую адгрузку іх на месцы прызначэньня, не дапускаючы залежваньняў ні на адзін дзень.

Грамадзкім арганізацыям і кіраўніцтву транспарту неабходна забясьпечыць адгрузку матарыялаў для Донбасу належнай колькасьцю вагонаў, пляцовак і г. д., бо сёньня павінна быць кожнаму зразумела, што гэтае забясьпечаньне ёсьць актуальнейшая і адказнейшая задача кожнай арганізацыі, кожнай установы і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Уся работа іх у гэтым напрамку павінна праходзіць пад лёзунгам—**«не дапусьціць зрыву ў забясьпечаньні дапаможнымі матарыяламі энэргетычнага нэрву буйнай сацыялістычнай прамысловасьці саюзу. Неабходна даць Данбасу лес!**

Да месячніка не гатовы

Клімавічы (наш. кар.). Усяго па Клімавіцкім раёне павінна быць загатавана будаўнічага матар'ялу 6.220 к. м. і апалу 1.700 к. м. і вывезена будаўнічага матар'ялу 14.885 к. м. і апалу 18.750 к. м.

Ня гледзячы на абвешчаны месячнік па лесазагатоўках і вывазцы лесаматар'ялаў і апалу, кантрольныя лічбы загатоўкі і вывазкі яшчэ цалкам не даведзены да калгасаў і адпаведных гаспадарак.

Сельсаветы амаль ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы месячніка ня прымаюць. Вучлесгасы несваячасова сыгналізуюць аб надыходзячым новым прарыве. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі яшчэ ня сталі на чале гэтай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Кулацка-заможная частка, як і ўзімку, застаецца не кранутай—ніхто не правярае выкананьня дадзеных ёй цьвёрдых заданьняў.

В. Бальзоўскі.

Раўнайцеся па Бярэзінскім вучастку

Бабруйск, 13-6 (БЕЛТА). Бярэзінскі вучастак паказвае сапраўдны ўдарны тэмпы працы па разгортваньні сплаву. Ня гледзячы на тое, што вучастак знаходзіўся ў самых цяжкіх умовах працы: веснавою вадою зьнесена 14 грэблаў, якія трэба было аднавіць, вучастак пасьпяхова спраўляецца з заданьнем, на 12 чэрвеня выканаў пляны звыш 70 проц.

Пасьпяховаму выкананьню заданьня спрыяла шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі брыгадамі.

Ударная брыгада сплаўшчыкаў Сьвіслацкага падвучастку высунула сустрэчны плян па вязцы, скатцы і спуску на ваду драўніны. У той час, як па пляну заданьне на месяц роўна 600 куб. мэтраў—брыгада па сустрэчным пляне ўзяла абавязак выканаць 700 кубмэтраў. Брыгада з посьпехам спраўляецца з выкананьнем гэтай лічбы.

Жаночыя брыгады на падвучастках Жыліства, Арэшкавічы, Жукавец у ліку 45 асоб, заключылі паміж сабою сацумову. Заключэньне сацумовы зьні шчыла канчаткова прагулы, павялічыла прадукцыю. Калі да заключэньня сацумовы выпрацоўвалася ў дзень на 1 жанчыну 5-6 кубмэтраў (па папруз цы дроў у баржы), дык пасьля выпрацоўка на 1 жанчыну даведзена да 8-9 кубмэтраў.

Па Бярэзінскім вучастку трэба раўняцца астатнім сплаўным вучасткам Бярэзінска - Дняпроўскага сплаўнога раёну.

Безгаспадарчасьць на лесасплаве

Віцебск, 13-6 (БЕЛТА). Сплаў драўніны зімовай вывазкі надыходзіць да канца. Значнае недавыкананьне пляну зімовай нарыхтоўкі драўніны ставіць зараз перад леспрамгасамі задачу разгарнуць працу па летняй нарыхтоўцы і падвозцы драўніны да румоў.

Берагі Дзьвіны ў Віцебску загружаны плытамі. ЦРК дровы не выгружае. Плыты-ж знаходзяцца без канатаў і не адгароджаны і пры пад'ёме вады могуць уплысьці.

На румах Астроўскага вучлесгасу безгаспадарчасьць. Бярэвеньні экспартнага і мясцовага значэньня раскіданы без сартоўкі. Доўгі час на беразе 20 плытоў чакаюць адпраўкі. Многія рабочыя кідаюць работу. Адказнай асобы за правядзеньне сплаву няма.

Плытавы сплаў на р. Вобань скончаны на 20 дзён раней, чым у мінулым годзе. Зараз сплаўшчыкі і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал пераключыліся на маляваны сплаў і абяцаюць, што на падставе сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня згубіўшы ніводнага бервяна, сплавяць драўніну раней тэрміну.

Рэдакцыі газэт „Бальшавік Барысаўшчыны" „Сав. Бел."

16-VI роўна а 7 гадз. ўвечары склікаюць у памяшканьні рэд. газ. «Бальшавік Барысаўшчыны» сход рабкораў працуючых у сыстэме спажыўкаапэрацыі па пытаньні абгаварэньня тэзісаў да рабсельскораўскага зьезду, ролі рабселькораў у перабудове спажыўкаапэрацыі.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: РК КП(б)Б, Райпрафсавету і праўленьні: саюзу работнікаў гандлю і каапэрацыі БЦРК, БЗРК, каапэрацыйны актывы і члены крамавай камісіі.

Просьба на нараду зьявіцца без спазьненьня.

У бой за торф

Топкі заводаў і фабрык чакаюць торфу

Вышэй тэмпы торфаздабычы!

12 чэрвеня 1931 г.

Зводка выпрацоўкі торфу па Бел'аб'яднаньні на 12-га чэрвеня прыносіць весткі аб тым, што плян дзённай здабычы выкананы на 29 проц. У параўнаньні з дзённай здабычай 11 чэрвеня назіраецца паніжэньне.

Вось заводы, якія цягнуць уніз крывую здабычы торфу.

«Грэбнёва» — 11 чэрвеня даў 42,5 проц., а 12—38,7, «Давыдаўка»— 11 дае 63,7 проц., а 12—, 11,4 проц., Чырвоны Тарянік—11 чэрвеня дае— 82,6 проц., а 12—56,2 проц., Міхановічы 11—62,6 а 12—43,1, Новая Беларусь—11 — 84,5, а 12—56,2, Першае Мая—11—32 проц., а 12—27,3 проц., Асінторф 11—34, а 12—30,7 проц., Шлях Сацыялізму 11—27,8 проц., а 12—22,9 проц. Свабода—11—23,8, а 12—21 проц.

Толькі адзін торфазавод «Ленінскі Шлях» на працягу 2 дзён выконвае праграму звыш заданьня.

Па БССР торфаздабыча за 12-га чэрвеня падае ўніз. Сэзонны плян па Белторфе на 12-га чэрвеня выкананы на 7,5 проц.

Тэмпы торфаздабычы да гэтага дню яшчэ прадоўжваюць падаць уніз, здабыча ня выходзіць з рамак 30 проц. дзённай здабычы. Плян торфаздабычы знаходзіцца пад вялікай пагрозай зрыву і не адчуваецца яшчэ рэзкага пералому ў бок ліквідацыі прарыву.

За апошні час мабілізацыя 500 камуністаў на лесараспрацоўкі, увага друку, якая аддаецца торфаздабычы павінны былі ўзьняць работу на торфазаводах, але да гэтага часу віжкага эруху яшчэ не дабіліся.

Трэба напружыць усе сілы і па бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю прарыву.

Гатовы да сустрэчы торфу

Чырвонаштандарны гарбарны завод «Бальшавік» працуе зараз цалкам на каменнавугальным апале, бо іншага яшчэ няма. Аднак, для таго, каб забясьпечыць пераход з гэтага апалу на тарфяны і гэтым самым вызваліць каменны вугаль для патрэб цяжкай індустрыі, завод клапоціцца аб забясьпячэньні сваёй вытворчасьці неабходнай колькасьцю торфу.

Ужо зараз 6 лепшых ударнікаў-рабочых пасланы на торфараспрацоўкі на ўвесь сэзон работы, каб дапамагчы торфазаводам выканаць і перавыканаць пляны здабычы торфу, бо гэта дасьць магчымасьць прадпрыемствам БССР пераключыцца на тарфяны апал больш танны і блізкі ў сэнсе дастаўкі, чымся прывезены з далёкага Донбасу каменны вугаль.

Пасылкаю рабочых-ударнікаў на дапамогу торфаздабычы «Бальшавік» спрыяе хутчэйшаму стварэньню беларускага тарфянога Данбасу, хутчэйшаму ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі і ўраду аб пераводзе прамысловасьці БССР выключна на тарфяны апал.

Пераабсталяваньне ўнутры заводу для пераключэньня на апал торфам «Бальшавік» здолее правесьці за пару дзён, прычым 30-40 проц. вытворчасьці будзе абслужана торфаапалам.

Чырвонаштандарны «Бальшавік» заўсёды гатоў на выкананьне закліку сталёвага кіраўніцтва партыі.

Г. Ш.

Дзень школы—баявая праверка вынікаў барацьбы за ўсеагульнае навучаньне, за палітэхнізацыю, за культурную рэвалюцыю

„Ні навучаньне і адукацыя без вытворчай працы, ні вытворчая праца без паралельнага навучаньня і адукацыі не магло быць пастаўлена на тую вышыню, якая патрабуецца сучасным узроўнем тэхнікі і станам навуковых ведаў".

(ЛЕНІН).

„Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага першапачатковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці павінна стаць баявой задачай партыі ў бліжэйшы пэрыяд".

(З ПАСТАНОВЫ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ).

„Галоўнае цяпер — перайсьці на абавязковае першапачатковае навучаньне. Я гавару „галоўнае", бо такі пераход азначаў-бы рашаючы крок у справе культурнай рэвалюцыі".

(СТАЛІН).

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ

на разгорнутую падрыхтоўку да новага навучальнага году, на барацьбу за перавод палітэхнізацыі школы на высшую ступень, за камуністычнае выхаваньне

Нашы дасягненьні за год палітэхнічнай школы

Учора пралетарскі Менск сьвяткаваў «дзень школы». «Дзень школы» зьявіўся днём мабілізацыі працоўных мас на барацьбу за ўсенавуч, за палітэхнізацыю школы, за камуністычнае выхаваньне.

Роўна год таму, назад у чэрвені месяцы на другой усесаюзнай партнарадзе па нарасьвеце вынесена гістарычная пастанова аб палітэхнізацыі школы. XVI партзьезд задача палітэхнізацыі школы і ўсеагульнага абавязковага навучальня высунута, як баявая задача партыі.

Як-жа Менскія гарадзкія школы выканалі дырэктыву партыі? З якімі каснымі і колькаснымі паказьнікамі ў галіне палітэхнізацыі, камуністычнага выхаваньня, правядзеньня ўсенавучаньня мы прыходзім да канца навучальнага году?

За гэты навучальны год школа пережыла сапраўдную рэвалюцыю. Сотні тысяч дзятвы ўцягнуты па ўсенавучаньню ў школу. Па Менску мы маем ўжо ўсеагульнае навучаньне на базе сямігодкі, сетка школ павялічылася на 27 груп, ахват дзяцей школай вырас з 14.500 да 17.000.

Гарачымі сьнеданьнямі і гарбатай абслугоўвалася 100 проц. вучняў гарадзкіх школ. Гарачымі сьнеданьнямі заясьнечана 35 проц. вучняў. На дапамогу бяднейшым вучням па мясцовым юджэце асигнаваньні вырасьлі з 5.000 р. у мінулым годзе да 50.000 ёлета. Сіламі пралетарскай грамадзкасьці сабрана на дапамогу беднаце 4.800 руб.

На сёньняшні дзень усе Менскія школы ўвязаліся з вытворчасьцю і вядуць ФЗС; усе школы таксама прымацаваны да прыгарадных калгасаў, саўгасаў, дзе яны праводзілі вялікую работу ў час асеньняй уборачай і веснавой пасеўнай кампаній, па арганізацыі працы ў калгасах, па арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Пралетарская грамадзкасьць, як ніколі, у гэтым годзе прымала актыўны дзел у рабоце школы, ажыцьцяўляла пралетарскі кантроль над яе работай. Палітэхнічная праца дзяцей на вытворчасьці зрабілася сапраўды справай гонару, справай доблесьці і славы дзяцей.

Мы маем значны эрух у бок палітэхнізацыі школ і ўдзелу школы ў сацбудаўніцтве. Гэты год, як ніколі нам паказаў, што пралетарскія дзеці вядуць моцным фактарам у справе сацбудаўніцтва, у барацьбе за прамфінплян, за пяцігодку ў чатыры гады. На большасьці прадпрыемстваў маюцца ўдарнікі-вучні працавалі суполка з рабочымі на вытворчасьці на ліквідацыі прарываў. Ёсьць вельмі ўдалыя спробы ўвязкі тэорыі з практыкай, барацьбы за тое, каб школа зрабілася апраўдным цэхам заводу. Наступныя ічбы зьяўляюцца яскравымі паказьнікамі таго, які сапраўды глыбокі эрух мы маем у справе сацыялістычнай рэканструкцыі школы.

На 40 школах гораду Менску на фабрыках і заводах адкрадавана звыш 9 тысяч чалавека-дзён. Па ўборачнай кампаніі і веснавой сяўбе адпрацавана каля 28.000 чалавека-дзён. На трактарную калёну сабрана аднымі вучнямі 50 рублёў і на пазыку «пяцігодка ў чатыры гады» вучні (без настаўнікаў) адпісаліся на 12.671 руб., сабрана і зкіравана ў саўгасы і калгасы 120 сн попелу. Вінніка розных газэт і часопісаў сярод вучняў складае каля 0.000 экз.

Усё гэта кажа аб нашых дасягненьнях аб тым, што зроблены значныя сур'ёзныя крокі ў справе палітэхнізацыі школы, у справе яе сацыялістычнай рэканструкцыі.

Але барацьба за палітэхнізацыю школы выявіла і агаліла таксама многа перашкод, праблем, складаных пытаньняў, якія павінны быць вырашаны ў працэсе пабудовы палітэхнічнай школы. Мы лічым яшчэ зусім недастатковай работу па сапраўднай увязцы тэорыі і практыкі, палітэхнізацыі праграм, вучэбнай работы. Яшчэ зусім малыя крокі зроблены ў галіне пераводу работы школы на мэтод праектаў. Ёсьць выпадкі, калі работа дзяцей на вытворчасьці, у калгасах скарыстоўваецца як падсобная сіла, ня мае ніякага вучэбна-выхаваўчага значэньня. Мы маем перашкоды і з боку прадпрыемстваў і устаноў, якія не дапускаюць дзяцей на палітэхнічную практыку. Мы мелі таксама выпадкі і яўна клясаварожых выступленьняў супроць сацыялістычнай перабудовы школы. Такім выступленьням даваўся і павінен давацца самы рашучы адпор. Усё гэта патрабуе разгорнутай барацьбы ўсёй пралетарскай грамадзкасьці за якасьць школьнай працы, за сапраўды палітэхнічную школу, за камуністычнае выхаваньне.

Школа змагаецца за суцэльную пісьменнасьць.

Выпраўленьне гэтых задач немагчыма бяз удзелу саміх дзяцей, бяз школьнага самакіраваньня, якія пры актыўным кіраўніцтве і ўдзел камсамольскіх і піянэрскіх арганізацый зьяўляюцца арганізатарамі барацьбы ўсіх пралетарскіх дзяцей за сацыялістычную рэканструкцыю школы.

Недарма зараз у Маскве адбываецца Усесаюзная канфэрэнцыя па рэканструкцыі форм дзіцячага самакіраваньня ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі палітэхнічнай школы. Барацьба за новыя формы самакіраваньня, якія здолеюць забясьпечыць актыўнае ўцягненьне дзяцей у сацыялістычнае будаўніцтва, барацьба за перавод палітэхнізацыі школы на вышэйшую ступень-павінны разгарнуцца з новай сілай у новым навучальным годзе.

У «дзень школы» працоўны Менск падагульваў вынікі гадавой работы школ, мы правяралі выкананьне ўсімі арганізацыямі дырэктыў партыі ў галіне палітэхнізацыі і ўсенавучу. «Дзень школы» мы ўвязвалі з барацьбой за выкананьне культпляну 1931 году, за адзіны культплян, за разгортваньне культработы ва ўмовах лета, за бальшавіцкую падрыхтоўку да асеньняй уборачнай, за сваячасовую падрыхтоўку да новага навучальнага году, які павінен узьняць палітэхнізацыю школы на вышэйшую ступень, які будзе новым этапам барацьбы за высокую якасьць школьнай працы.

Брыгада газ. «Сав. Бел.», «ЗКП» і ЦП працасьветы Мееровіч, Равін, Дзятко і Бір.

Яшчэ рашучай змагацца за ператварэньне ў палітэхнічную

«Дзень школы», які зараз праводзіцца ў Менску, ня можа быць толькі днём дэкларацый і дэманстрацый, ён павінен стаць днём сапраўднай праверкі нашых дасягненьняў і недахопаў. Мы павінны ведаць, як на справе ажыцьцяўляюцца дырэктывы партыі аб усеагульным навучаньні і палітэхнізацыі.

Менская ФЗС № 21 у канцы верасьня 1930 году была прымацавана да Эльводкамбінату і ў справе палітэхнізацыі маем значныя посьпехі. Гэтымі дасягненьнямі зьяўляюцца: пабудова пры школе сьлясарна-мэханічнай майстэрні, якая больш-менш добра абсталявана. Майстэрня пры школе адначасова зьяўляецца і цэхам электрастанцыі.

Вучні, пачынаючы з 4-й групы, інструктаваліся кваліфікаванымі рабочымі. Вылучаны сэкцыяй інжынэрна-тэхнічных работнікаў тэхнік на працягу ўсяго году знаёміў вучняў 6 і 7 груп, па загадзя распрацаванай праграме.з вытворчасьцю. На працягу першых 4-х месяцаў вучні 6 і 7 груп пад кіраўніцтвам рабочых на прадпрыемстве знаёміліся з працэсамі вытворчасьці.

Для азнаямленьня і прынцыцця ўдзелу ў прамадзкім жыцьці Эльводу вучні 5, 6 і 7 груп былі разьбіты на брыгады па 5-6 чалавек. Гэтыя брыгады знаёміліся з вытворчымі нарадамі цэхаў, сэктарамі заўкому, з работай дабраахвотных арганізацый і г. д.

Сьвяткаваньне рэвалюцыйных сьвят праводзілася школай разам з калектывам рабочых. У часе перавыбараў савецкай арганізавалі брыгаду нянек, рассклі выбарчыя позвы. У барацьбе за прамфінплян выяўлялі прагульшчыкаў, для якіх наладзілі чорную касу, расчышчалі дарогі ад сьнегу, падавалі апал у топкі. Уцягнулі 18 няпісьменных рабочых на ліквпункт пры школе.

Разам з рабочымі Эльводу вучні 6 і 7 груп для правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі выяжджалі ў Папярнянскі сельсавет і ў Калодзішчы, дзе працавалі каля 200 рабочых дзён.

Настаўнікі прайшлі адпаведную практыку па вывучэньні вытворчасьці. Пра выдзеньнем палітэхнізацыі кіравала і кіруе камісія садзейнічаньня палітэхнізацыі школы. Заўком ня раз ставіў на сваіх нарадах спэцыяльна пытаньні па палітэхнізацыі школы. Былі выдзелены рабочыя, якія зведвалі вытворчыя нарады школы. Уся работа па палітэхнізацыі знайшла свой адбітак у дагаворы школы з Эльводкамбінатам. Асабліва значная зацікаўленасьць рабочых Эльводу выявілася к канцу навучальнага году па пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году. У выніку сіламі рабочых будзе арганізавана электра-тэхнічная лябараторыя з пастаноўкай у ёй вопытаў з электрычнасьцю.

Але побач з дасягненьнямі ў ператварэньні славеснай школы ў палітэхнічную маюцца і буйнейшыя недахопы. Мы да гэтага часу, напрыклад, ня маем дакладна распрацаванай праграмы вывучэньня самай вытворчасьці. І толькі зараз, дзякуючы рашучым мерам, ужытым заўкомам, мы будзем мець гэту праграму. Прыходзіцца канстатаваць ня досыць сур'ёзныя адносіны да палітэхнізацыі з боку паасобных працаўнікоў і з боку заўкому, а асабліва з боку адміністрацыі. Трэба памятаць, што школа ня рыхтуе рамесьнікаў, а рыхтуе работнікаў сучаснага заводу, саўгасу, калгасу. Між тым, ёсьць імкненьне замкнуць школу ў майстэрню пры школе. «Майстэрні пры школе—цэх Эльводу, ну і працуй це сабе на здароўе, а на Эльвод няма чаго ісьці», кажуць некаторыя працаўнікі Эльводу. Пры дапамозе ўсяго рабочага калектыву павінны быць зьнішчаны ўсе гэтыя недахопы і недарэчнасьці.

А. П.

Другая ФЗС Менску мабілізавалася на работу ў саўгасе на ўсё лета

2-я ФЗС зьвязана з прыгарадным саўгасам імя «Лекерта» і ўвесь час пра водзіла там работу, як практычную, так і па культурным абслугоўваньні рабочых саўгасаў. Актыўны ўдзел прыняла школа ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны: ў школьных майстэрнях зроблены і зданы саўгасу 25 жалезных і 25 драўляных грабель, школай сабрана 6,5 тон попелу і адпрацавана 1048 чалавекадзён.

Праведзена школай таксама досыць значная культработа па абслугоўваньні другой бальшавіцкай: арганізавана бібліятэка, устаноўлена ў саўгасе свамі сіламі 4 радыё-прыёмнікі, увесь час пасеўкампаніі школа абслугоўвала саўгас мастацкімі выступленьнямі, пісала лёзунгі, плякаты, зрабіла 3 даклады на агульных сходах рабочых саўгасаў і г. д.

Сумесна з заводам «Камунар» школа ў час пасеўнай кампаніі абслугоўвала Караліцкавіцкі сельсавет, куды выяжджалі брыгады вучняў, з настаўнікамі. У калгасе гэтага сельсавету школай праводзілася практычная работа па сяўбе, а таксама культурная і антырэлігійная.

Школа мабілізавала сябе на работу ў саўгасе на працягу ўсяго лета. Утворана брыгады вучняў-дабрахвотнікаў, якія пастанавілі ў час летняга адпачынку працаваць дзень дзень у дэкаду, а піянэр-база за лета дасьць саўгасу 500 рабочых чалавека-дзён.

Менская 2-ая ФЗС.

Выканаць дырэктывы ЦК КП(б)Б аб распаўсюджваньні і дастаўцы друку

Загад № 101

па Беларускім кіраўніцтве сувязі

ад 12 чэрвеня 1931 г.

§ 1.

У студзені месяцы Сакратарыят ЦК КП(б)Б па маім дакладзе аб палепшаньні дастаўкі друку, вынес шэраг яскравых пастаноў. У тым ліку і пастанову аб тым, каб да 1 красавіка вылучыць собную дастаўку друку ад іншых відаў карэспандэнцыі ў гарадох Менск, Гомель і Віцебск.

Пры праверцы выкананьня гэтай важнейшай палітычнай пастановы,—выявілася, што да гэтага часу звыш вызначанага тэрміну прайшло 1½ мес.), у Гомелі і Віцебску дастаўка ня вылучана, і пастанова ЦК КП(б)Б фактычна пайшла на смарку.

Матарыялы па гэтым пытаньні сьведчаць аб тым, што адказныя працаўнікі, як Кіраўніцтва Сувязі, так і на месцах, бюракратычна гэтую пастанову сказілі, жывую справу заглушылі паперовай перапіскай, там напрыклад УПЛ т. Бандарык у гэтым пытаньні не праявіў дастатковай і патрэбнай рашучасьці ў прыватнасьці ў праве сваячасовага забясьпечаньня дастатковым штатам Гомельскай і Віцебскай каторы з тым, каб яны сваячасова маглі вылучыць дастаўку друку і выканаць пастанову Сакратарыята ЦК і мой загад.

УНГ т. Анташэўскі не праявіў дастатковай і патрэбнай распарадзіцельнасьці аб выкананьні гэтай пастановы, сваячасова не праверыў як яна праводзіцца і выконваецца на месцы.

КЗ Віцебск і Гомель т т. Жыбінскі і Пісарчык не праявілі патрэбнай ініцыятывы, падыйшлі да вырашэньня этага пытаньня па казённаму і да этага часу яшчэ дастаўка друку ў этах значнага яе палепшаньня ня вылучана, тому загадваю:

1) УПЛ т. Бандарыку і УНГ т. Анташэўскаму за пералічаныя вышэй недаходы ў іх рабоце, у выніку чаго ня былі выкананы пастановы ЦК КП(б)Б і адпаведныя маё распараджэньні—паставіць на від.

2) Надаючы вялікую важнасьць справе распаўсюджваньня і дастаўкі друку і ўлічваючы, што на сёньняшні дзень па ўсім БССР гэта справа пастаўлена неадвальняюча, у мэтах узмацненьня гэтай работы УНГ Анташэўска га аслабаніць ад кіраваньня паштовымі справамі, заставіўшы за ім толькі распаўсюджваньне і дастаўку друку. Кіраваньне газэтна-паштовым сэктарам ускладаю на майго намесьніка т. Камянёва.

3) Загадчыку Менскай Канторы ў выкананьне пастаноў Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ак 11-І і 11-VI—г. г. забясьпечыць сваячасовую дастаўку друку з друкарні ў газэтную экспедыцыю да 7 гадз. раніцы. Пад асабістую адказнасьць т т. Якаўлева і Гольдмана не пазьней 15-VI г. г. распрацаваць такія кантрольныя тэрміны дастаўкі газэт па гораддзе, каб да надвісчыка газэта дайшла ў гораддзе не пазьней 9 гадз. раніцы. Таксама унесьці яскравасьць у кантрольныя тэрміны адпраўкі газэт на цягнікі па парыфэрыі БССР.

4) КЗ Віцебск і Гомель т. т. Жыбінскаму і Пісарчыку абвяшчаю суровую вымову з папярэджаньнем.

5) Пад асабістую адказнасьць т. т. Бандарыка, Анташэўскага, Жыбінскага і Пісарчыка не пазьней 15-VI поўнасьцю вылучыць дастаўку друку ад усіх іншых відаў карэспандэнцыі ў Гомлі і Віцебску.

6) УКІ т. Сяргеяву праверыць выкананьне гэтага загаду і не пазьней 17-VI аб выніках мне далажыць.

Гэты загад абвясьціць у друку.

Начальнік Беларускага Кіраўніцтва Сувязі Дубіна.

Барацьба за беларусізацыю—барацьба за генэральную лінію партыі

У Клімаўшчыне праверка беларусізацыі праводзіцца фармальна. Шклоўскі і Быхаўскі раёны нацменработу адсунулі на задні плян

Рашуча змагацца за поўнае практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

Такая праверка нікому ня патрэбна

КЛІМАВІЧЫ (наш. кар.). У сакавіку месяцы бюро Клімавіцкага РК КП(б)Б, праверыўшы становішча беларусізацыі ў раёне адзначыла, што пастановы Кастрычніцкавага пленуму ЦК КП(б)Б у галіне беларусізацыі, абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй і інтэрнацыянальнага выхаваньня выконваюцца вельмі нездавальняюча. Бюро РК дало рад практычных дырэктыў партыйным ячэйкам і камсамольскай арганізацыі, накіраваных на тое, каб выправіць гэты буйнейшы недахоп у рабоце партарганізацыі.

Аднак, належнага зруху ў гэтай рабоце яшчэ няма і на сёньняшні дзень. У мая месяцы райпрафсаветам былі вылучаны брыгады для праверкі становішча беларусізацыі ў раённых установах. Але гэтыя брыгады, арганізаваныя выключна з настаўніцтва і праф работнікаў бяз удзелу рабочай і працоўнай грамадзкасьці не далі належных вынікаў, бо работа гэтых брыгад зьвялася да «казённай» павярхоўнай праверкі «чужыньня белмовы». Глыбокай-жа праверкі ўкараненьня асноў нацыянальнай палітыкі, жывых прыкладаў скажэньня яе, якіх у раёне ёсьць шмат, брыгады ня выявілі. Шырокіх агульных сходаў рабочыя брыгады не праводзілі, а абмежаваліся толькі тым, што «абышлі» рад устаноў і на-хаду зрабілі павярхоўныя вывады.

Так, брыгада ў складзе т. т. Белавусава, Галіцкага і Гарэліка якая абсьледвала становішча беларусізацыі ў райсаюзе ў сваіх вывадах запісала, што «з ужываньнем белмовы справа абстаіць наогул здавальняюча». Гэта ў той час, калі райсаюз абсалютна ніякай масавай выхаваўчай работы па пытаньнях нацпалітыкі не вядзе, калі ў райсаюзе больш паловы працаўнікоў, гутараць па-расійску, калі там інтэрнацыянальнае выхаваньне як і іншая масавая работа знаходзіцца ў поўным заняпадзе. Брыгада, якая пабывала ў гарпо, запісала, што ў гарпо «белмова ўжываецца дастаткова». Гэта значыць, што ў гарпо ў галіне беларусізацыі зроблена ўсё і ніякай далейшай работы праводзіць ня трэба, а што амаль усе працаўнікі апарату гарпо і прылаўка гутараць на расійскай мове ня толькі паміж сабой, але і з наведвальнікамі — гэтага брыгада не заўважыла.

У райкалгассаюзе брыгада знайшла, што «за выключэньнем асобных працаўнікоў, якія нядаўна паступілі на работу, белмова ўжываецца дастаткова». А што райкалгассаюз зрабіў у галіне разгортваньня інтэрнацыянальнага выхаваньня шырокіх мас калгасьнікаў, як райкалгассаюз рэагуе на асобныя выпадкі праяўленьня антысэмітызму ў калгасах, як пастаўлена работа ў нацыянальных калгасах — гэтым брыгада ня цікавілася. У прамсаюзе, які на 90 проц. абслугоўвае яўрэйскае насельніцтва, брыгада заўважыла «памылкі з боку беларускага правапісу».

Адносна таго, як абслугоўваецца яўрэйскае насельніцтва на іх роднай мове, у вывадах ніводнага слова ня сказана.

Райпрафсавет, разгледзеўшы гэтыя вынікі, пастанавіў: «з вывадамі брыгад згадзіцца». і прапанаваў усім прафарганізацыям тэрміновa арганізаваць рад гурткоў па вывучэньні белмовы. У гэтай абсечанай пастанове райпрафсавет паказаў свае неразуменьне сутнасьці нацыянальнай палітыкі партыі, адрываючы беларусізацыю ад агульных задач партыі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і неабходнасьці барацьбы з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам і шавінізмам іншых колераў.

Ня дзіва, што такая праверка не зрабіла ніякага зруху ў справе беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцяй. Пастанова аб арганізацыі гурткоў засталася толькі на паперы.

Месячнік беларусізацыі, які зараз праводзіцца, павінен зрабіць сапраўдны пералом у гэтай справе. Трэба выкрыць канкрэтных вінаўнікаў зрыву справы беларусізацыі. Райком КП(б)Б і РКК павінны зараз-жа ўзяцца за разгортваньне гэтага месячніка.

В. Бальзоўскі.

У Шклове і Быхаве работу сярод нацменшасьцяй адкладаюць на больш вольны час

Агляд работы культпалітасьветных установаў пад кутом погляду абслугоўваньня імі нацменшасьцяй ставіў сваёю мэтаю дабіцца таго, каб работа гэтых установаў стала сапраўднай зброяй у барацьбе за генэральную лінію партыі, каб паскорыць перабудову работы гэтых установаў тварам да вытворчасьці, тварам да абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй.

Між тым, многія раёны не ўявілі буйнай палітычнай важнасьці гэтай справы.

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР агляд павінен быў скончыцца да 15 мая, з такім разьлікам, каб да 1 чэрвеня былі падагулены вынікі агляду, але-ж і на сёньняшні дзень рад раёнаў ня толькі ня скончыў агляд, але яшчэ не пачынаў. Шклоўскі Райвыканком, атрымаўшы дырэктывы і матар'ялы па агляду, зусім не азнаёміўшыся з імі, перадаў іх райінспэктару Нарасьветы (ён-жа сакратар Нацкамісіі), які ў сваю чаргу палажыў іх да спраў Нацкамісіі, гэтыя матар'ялы праляжалі з сакавіка па чэрвень месяц нікому невядомымі, ні райвыканкому, ні райкому партыі.

На запытаньне старшыні РВК чаму ўсё-ж такі гэты агляд не праведзены, адказ быў такі: «у нас зараз больш важная работа: як пасеўная кампанія, вучот аб'ектаў абкладаньня, мабілізацыя сродкаў, зусім няма часу займацца аглядам. Выходзіць, што нацпалітыкай, справай культ-выхаваўчай работы сярод працоўных нацменшасьцяй можна заняцца тады, калі будзе вольны час.

Гэта права-апартуністычная недаацэнка важнейшага пытаньня не атрымала адпору з боку Райкому КП(б)Б.

Зразумела, што ў выніку такіх адносін да работы сярод працоўных нацменшасьцяй у гэтай галіне ёсьць рад буйнейшых прарываў.

На Шклоўскай папяровай фабрыцы рабочых і служачых палякаў налічваецца каля 40 чалавек; сярод іх ніякай работы не праводзіцца. Газэты «Орка» ня выпісваецца ніводнага экз. Рабочых яўрэяў на папяровай фабрыцы таксама многа, газэты «Акцябр» выпісваецца толькі 6 экз. Характарна адзначыць, што прадаўшчыца газэт у ларку папяровай фабрыкі на запытаньне ці ёсьць газэта «Орка» і «Акцябр», са зьдзіўленьнем запытала: «а якая гэта газэта—нямецкая»? У цэнтральнай бібліятэцы гор. Шклову з 3377 экз. кніг, беларускіх налічваецца ўсяго толькі 78 экз. і ніводнай польскай кнігі. Ёсьць думка з боку паасобных рабочых папяровай фабрыкі, што палякаў у Беларусі няма, гэта толькі «католікі-беларусы». Наогул заўважаецца з боку паасобных нацменшасьцяй нейкая саромлівасьць прызнаць сваю нацыянальнасьць. Гэта яшчэ раз нам гаворыць аб тым, што ніякай работы сярод нацменшасьцяй не праводзіцца.

Такое-ж становішча з аглядам і ў Быхаўскім раёне. Тут гэта пытаньне хапя і абгаворвалася на нацыянальнай камісіі, нават арганізаваны райштаб на аглядзе, але ўсё гэта засталося на паперы, агляд работы культпаліт-асьветных установаў па іх рабоце сярод нацменшасьцяй не праведзены. Існуюць такія-ж самыя разважаньні як і ў Шклоўскім раёне: «зараз у нас пасеўная кампанія, няма часу займацца аглядам» і г. д. Сакратар Быхаўскай нацкамісіі проста заявіў: «паспрабуй зараз, падсунься толькі з гэтым пытаньнем».

Пры Быхаўскім РВК, згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК павінна быць арганізавана нацкамісія з платным работнікам, нацкамісія арганізавана, але штатная адзінка не скарыстана і на сёньняшні дзень платнага работніка нацкамісіі—няма.—На запытаньне чаму няма адказнага сакратара нацкамісіі, адказ быў такі: «яму няма чаго рабіць, толькі дарма грошы будуць трацць на яго».

Такія адносіны да работы сярод працоўных нацменшасьцяй інакш нельга разглядаць, як нежаданьне выконваць важнейшую дырэктыву партыі ў галіне нацпалітыкі. Па гэтай недаацэнцы трэба неадкладна ўдарыць з усёй сілай.

У месячнік праверкі беларусізацыі трэба пакласьці канец такім направаўцельскім адносінам да работы сярод працоўных нацменшасьцяй. Гэта работа павінна быць узьнята на належную палітычную вышыню.

Дразлоўская.

Ударныя брыгады рабочых на вывучэньне беларускай мовы

Бабруйск. 7. (БЕЛТА). Рабочыя шэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага горача падтрымалі пачын менскіх ударнікаў заводу імя Варашылава аб вывучэньні беларускай мовы. На фабрыцы арганізаваны ўдарныя брыгады па вывучэньні мовы, гісторыі і эканомікі Беларусі. Такія-ж брыгады рабочыя абавязаліся стварыць у кожным атрэдзе і групе. Рабочыя фабрыкі імя Дзяржынскага выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу астатнія прадпрыемствы Бабруйску.

ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКУЮ ТАВАРНАСЬЦЬ СЬВІНАГАДОЎЛІ

Камплектаваньне сьвінагадоўчых фэрм праходзіць марудна. Таварнасьць стада вельмі нізкая па колькасьці і па якасьці. Сьвінаводцэнтр і райкалгассаюзы недастаткова кіруюць гэтай справай

150.000 СЬВІНАМАТАК ПАВІННА БЫЦЬ СЁЛЕТА ПАСТАЎЛЕНА Ў КАЛГАСНЫХ ФЭРМАХ

З арганізацыяй сьвінагадоўчых фэрм не сьпяшаюцца

Аршанскі раён атрымаў заданьне арганізаваць 5 сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмаў, у якіх вызначана паставіць 500 сьвінаматак. Але райкалгассаюз рашыў арганізаваць 9 фэрмаў з 680 сьвінаматкамі, матывуючы гэта тым, што ў пяці фэрмах нельга будзе разьмясьціць такую значную колькасьць сьвінаматак.

Ня гледзячы на тое, што арганізацыя сьвінагадоўчых фэрмаў мае вельмі важнае гаспадарча-палітычнае значэньне—гэтаму мерапрыемству на Аршаншчыне адводзіцца мала ўвагі. Камплектаваньне фэрмаў праходзіць вельмі марудна. Да гэтага часу ва ўсіх 9 фэрмах пастаўлена толькі 350 матак і 14 кныроў, што складае 52 проц. заданьня. Калгас «1-га жніўня» укамплектаваны сьвінаматкамі на 23 проц. «Вызваленьне жанчыны»—18 проц., «Авангард»—24 проц., «12-ці годзьдзе Чырвонай арміі»—20 проц., імя XV партзьезду—29 проц «Ленінскі Шлях»—56 проц., «Прамень асьвятленьня» — 71 проц., «Юны тварэц»—71 проц. Толькі камуна імя Х-ці годзьдзя Кастрычніка выканала плян камплектаваньня з перавышэньнем: Замест вызначаных 100 матак, у камуне пастаўлена 119 сьвінаматак і 2 кныры.

Плян камплектаваньня фэрмаў сьвінаматкамі праходзіць самацёкам. Райкалгассаюз ня кіруе гэтай справай. Закупка парасят веснавога апаросу не прадугледжана, вучот маладняка на фэрмах не арганізаваны. Нічога ня зроблена, каб наладзіць перакідку сьвінаматак з несьвінагадоўчых калгасаў.

Афармленьне фэрмаў догаварамі не праведзена. З дзевяці фэрмаў толькі тры афармлены догаварамі («Юны тварэц», Вызваленьне жанчыны» і «Прамень асьвятленьня»). Райкалгассаюз правяў поўную бязьдзейнасьць у гэтай справе. Але і тыя сьвінагадоўчыя таварныя калгасныя фэрмы, на якія ўжо высланы догавары, яшчэ не афармлены канчаткова, бо Сьвінаводцэнтр не зацьвердзіў іх. Трэба наогул адзначыць, што Сьвінаводцэнтр зусім ня цікавіцца становішчам і арганізацыяй сьвінагадоўчых фэрмаў на Аршаншчыне.

Па пляну ўсе сьвінагадоўчыя фэрмы Аршаншчыны павінны здаць дзяржаве да канца гэтага году ня менш 1.700 галоў таварных сьвіней. Пакуль што фэрмы не атрымалі яшчэ заданьняў. Для здачы патрэбны сьвіньні належнай вагі—ня менш 65 кг. кожная, а такіх сьвіней фэрмы маюць зусім мала. Чакаюць восені, тады толькі зьбіраюцца прыступіць да адкорму сьвіней.

Крыху лепш стаіць справа з будаўніцтвам сьвінарнікаў. Лесматар'ялы даволі, але нехапае цьвікоў, цэменту, жалеза. Ёсьць меркаваньні, што да восені будуць пабудаваны 10 сьвінарнікаў.

Справу арганізацыі і камплектаваньня сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмаў на Аршаншчыне трэба паставіць на баявыя тэмпы. На працягу чэрвеня трэба закончыць афармленьне фэрмаў.

Брыгада газ. «Сав. Бел.» А. Мілашэўскі, А. Міроічык, Я. Каган, Гесэн.

Канцэнтраваць нагляд за будаўніцтвам у адным месцы

На 1931 год па калгасах Бабруйскага раёну намечана будаўніцтва 99 аб'ектаў. Гэтае будаўніцтва павінна быць выканана ў пэўна-вызначаныя тэрміны. Між тым, будаўніцтва зусім не забясьпечана дэфіцытнымі матар'ялямі, крэдытамі, тэхнічным кіраўніцтвам.

Усё будаўніцтва праводзіцца пад тэхнічным наглядам толькі аднаго тэхніка, які знаходзіцца пры Райкалгассаюзе. Апрача таго, у абавязкі гэтага-ж тэхніка ўваходзіць нагляд за ўсімі работамі, якія не ўвайшлі ў плян будаўніцтва па ўсіх 98 калгасах раёну. Сюды ўваходзяць такія работы як рамонт жыльлёвых будынкаў, прыстасаваньне розных сельска-гаспадарчых будынкаў пад кароўнікі, сьвінарнікі і г. д.

Мы задаем пытаньне—ці можа адзін тэхнік абслужыць такое вялізарнае будаўніцтва, ужо не гаворачы аб па-за плянавым будаўніцтве? Зразумела, што не. Адзін тэхнік нават ня мае фізычнай магчымасьці аб'ехаць усе аб'екты і зрабіць неабходныя паказаньні (аб'екты раскіданы па ўсім раёне на 25—30 кілёмэтраў адзін ад аднаго). Адзін тэхнік ні ў якім разе ня можа справіцца з такой вялікай праграмай будаўніцтва.

Неабходна зараз-жа інакш пабудаваць тэхнічнае абслугоўваньне калгаснага будаўніцтва. Трэба ці стварыць моцную будаўнічую арганізацыю пры Райкалгассаюзах, у склад якой уваходзіла-б дастатковая колькасьць тэхнікаў пэрсаналу, ці зусім ліквідаваць пасаду тэхніка пры Райкалгассаюзах, а нагляд за будаўніцтвам ва ўсіх калгасах ускласьці на Белсельбуд.

Пытаньне гэта вельмі важнае і яго трэба зараз-жа вырашыць, бо ўсякая адцяжка ў гэтай галіне мяжуе са шкодніцтвам.

Тэхнік Бабруйскага Райкалгассаюзу **П. М. Анціпаў.**

Ад рэдакцыі: Допіс тав. Анціпава зьмяшчаецца ў нарду абгаварэньня.

Арганізаваць прыём рапартоў-справаздач ад калгасаў

Загадчыкам РайЗА, і старшыням Райкалгассаюзаў, Сельсаветаў і Праўленьняў калгасаў.

Работа па складаньні рапартоў-справаздач і дадатковых картак ідзе самацёкам. Калгасы Чавускага раёну («Чырвоны Май», Клімавіцкага раёну («Аб'яднаньне») і Глускага («Серп і Молат») непасрэдна прадстаўляюць да датковыя карткі ў Наркамзем БССР.

На картках няма подпісу старшыні сельсавету, даныя карткі не праверены раённымі брыгадамі па правядзеньні суцэльнага перапісу калгасаў.

Такая пастаноўка справы не гарантуе ад памылак у зьвестках рапартоў-справаздач, як не гарантуе і сваячасовасьць іх атрыманьня.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што РайЗА і Райкалгассаюзы не арганізавалі працу па суцэльным перапісе калгасаў, так, як гэта ўказывалася ў пастанове Наркамзему і Калгасцэнтраў, апублікаваных ў газэце «Савецкая Беларусь» за 21 Мая г. г.

Прапаную: 1. **Праверыць працу раённых, сельсаветскіх і калгасных брыгад па суцэльным перапісе калгасаў.**

2. **Прасачыць, каб сельсаветы пэрсанальна прымацавалі да кожнага калгасу адказнага работніка (настаўніка камасамольца, агранома і інш.), які-б удзельнічаў ва ўсіх стадыях работ калгаснай брыгады па складаньні рапартоў-справаздач і дадатковых картак, канчаючы працу асабістым прадстаўленьнем рапарта-справаздачы і дадатковае карткі раённай брыгадзе.**

3. **Усе даныя ў рапартох-справаздачах і дадатковых картках павінны заносіцца на час запаўненьня іх.**

4. **Працу па складаньні рапартоў-справаздач і дадатковых картак скончыць к 25 чэрвеня.**

Нарком Земляробства БССР **Рачыцкі.**

Старшыня калгасцэнтру **Міцькоў.**

Зьнішчыць недахопы ў дагляд дзе за сьвіньмі

Калгас «Трудавік», Ляднянскага раёну, мае сьвінагадоўчы напрамак, але сьвіньмі тут ня цікавяцца. Дагляд за сьвіньмі арганізаваны дрэнна. Агранам наведвае калгас вельмі рэдка.

Будаўніцтва сьвінарніка зрываецца. Летась пачалі будаваць сьвінарнік на 100 галоў, але будаўніцтва спынена. Сьвінарнік быў пабудаваны на балоце і яго прышлося пераносіць на больш высокае месца.

Трэба ўжыць захады, каб сьвінарнік быў пабудаваны і зараз-жа зьнішчыць дрэнныя адносіны да сьвіней.

Падрыхтоўка будаўнікоў зрываецца

Для падрыхтоўкі цесьляроў па будаўніцтву сьвінарнікаў у калгасах Лагойскага р. было пастаноўлена арганізаваць курсы на 50 асоб. Арганізацыя курсаў была даручана інспэктару кадраў Лагойскага раёну тав. Гузу. Апошні затраціў на арганізацыю курсаў да 1.000 руб.

Калі-

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Пра ход арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм і ход здачы імі таварнай прадукцыі

Выслухаўшы даклад пра ход арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм і здачу імі таварнай прадукцыі, Эканамічны Савет канстатуе, што пастанова СНК БССР за 3 студзеня 1931 году «Пра ход укамплектавання стада спэцыялізаваных калгасаў сьвінаматкамі і прадукцыйнаю буйнаю рагатаю жывёлаю». (З. З. БССР 1931 г. Аддз. II, № 1 паст. 6) і 3-га сакавіка 1931 г. «Пра мерапрыемствы для разьвіцьця жывёлагадоўлі ў 1931 годзе». (З. З. БССР, 1931 г. Аддз. II № 5, паст. 72) у частцы арганізацыі 445 малочна-таварных фэрм, з давядзеньнем на іх да канца 1931 г. колькасьці кароў да 78 тыс. з якіх ня менш 65 проц. павінна было быць на 1 чэрвеня, і здачы таварнай прадукцыі фэрмамі ня менш 46 тыс. тон малака,—на 1-е чэрвеня вы кананы зусім нездавальняюча:

і. Будаўніцтва ў фэрмах і камплектаваньне стада праходзіць такімі тэмпамі, якія яўна ставяць выкананьне пляну пад пагрозу зрыву.

2. Падрыхтоўка кадраў (210 тэхнікаў па буйнай рагатай жывёле і 3.800 жывёлаводаў) — разгорнута зусім нездавальняюча і да гэтага часу падрыхтавана толькі 1.331 жывёлавод, і пачалі працу курсы тэхнікаў на 40 асоб.

3. Падрыхтоўка і ход работы па выкананьні пляну сіласаваньня праходзіць нездавальняючымі тэмпамі, ні ў якім не забясьпечваючымі выкананьне намечанага пляну.

4. Асабліва нездавальняюча праходзіць здача фэрмамі таварнага малака і малочных прадуктаў, якая выражаецца на 1 чэрвеня ў 6,1 проц. гадавога заданьня.

За паказанае становішча калгасных малочна-таварных фэрм і невыкананьне не памяненых пастаноў СНК БССР адказнасьць нясуць:

а) Аддзяленьне Малакоцэнтру, у асобе яго загадчыка тав. Грыневіча, якое не ўжыла рашучых захадаў да сваячасовага сканчэньня дагаворнай кампаніі і ўкамплектаваньне фэрм жывёлай за лік унутраных рэсурсаў калгасаў, не забясьпечыла належнай падрыхтоўкі і коду будаўніцтва ў малочна-таварных фэрмах, дапусьціла зусім нездавальняючы ход здачы таварнай прадукцыі фэрмамі і не прыняла захадаў да мабілізацыі шырокіх калгасных мас на выкананьне задач па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў калгасах.

б) Кіраўніцтва Белкалгасцэнтру ў асобе тав. Міцькова, якое недастаткова кіравала райкалгассаюзамі ў справе арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм, а таксама ня ўжыло сваячасовых захадаў да разьвіцьця калгасных малочна-таварных фэрм, да забясьпечаньня выкананьня пляну падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі і здачы таварнай прадукцыі, недастаткова рашуча змагалася з апартуністычнай недаацэнкай гэтага пытаньня шэрагам райкалгассаюзаў у паасобку: Лепельскім, Гомельскім, Чашніцкім, Віцебскім, Гарадокскім, Дрысенскім, Прапойскім, Азарыцкім, Аршанскім, якія да гэтага часу не ўжылі канкрэтных захадаў да ажыцьцяўленьня вызначага пляну, да справы арганізацыі і разьвіцьця калгасных малочна-таварных фэрм.

в) Народны Камісарыят Земляробства, які да апошняга часу ня зьвярнуў увагі райза на выкананьне пляну арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм і ня ўжыў рашучых захадаў да выкананьня сваёй пастановы аб перадачы Малакоцэнтру і райкалгасаюзам зоатэхнічнага вэтэрынарнага пэрсаналу, сыстэм сельскагаспадарчай капэрацыі і зямельных органаў і які нездавальняюча разгортваў працу па падрыхтоўцы кадраў сярэдняй кваліфікацыі.

г) Белмяса, якое не выканала пляну ўкамплектаваньня малочна-таварных фэрм жывёлай і перадаўшага калгасам толькі 50 проц. пляну (разам з асобным кварталам).

д) Загатоўчыя арганізацыі — Белкаапсаюз і Хлебжывёлсаюз у асобе кіраўнікоў гэтых арганізацый т. т. Хаскіна і Жыромскага, за непадрыхтаванасьць іх сыстэм да загатоўкі малака. У цэлым шэрагу раёнаў (Мсьціслаўскі, Аршанскі, Магілёўскі, Гомельскі, Дрысенскі і інш.) малако, якое паступае ад фэрм, загатоўчымі пунктамі адпраўляецца назад; масавыя выпадкі недапушчальных адносін загатоўчых пунктаў да малочнай пасуды фэрм, прапажы, нескарыстоўваньне малочных адкідаў, адсутнасьць належнага наладжанага вучоту паступаючага малака і малочных прадуктаў ад калгасаў.

е) Саюзмалако, у асобе тав. Кузьняцова ня ўжыўшага да гэтага часу адпаведных мер для забясьпечаньня калгасных малочна-таварных фэрм патрэбным малочным інвентаром і пасудай, а таксама дэфіцытнымі прамтаварамі паводле пастановы Народнага Камісарыяту Снабжэньня.

ж) Шэраг раённых выканаўчых камітэтаў: Лепельскі, Гомельскі, Чашніцкі, Віцебскі, Гарадокскі, Дрысенскі, Прапойскі, Азарыцкі, Аршанскі і інш., якія да гэтага часу справе арганізацыі і разьвіцьця малочна-таварных фэрм ня ўдзялялі ніякай увагі, а плян у гэтых раёнах выкананы больш як на 15 пр.

Выходзячы з патрэбы поўнага выкананьня памянёных пастаноў СНК БССР — Эканамічны Савет пастанаўляе:

1. Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру і Загадчыку Аддзяленьня Малакоцэнтру да 1 ліпеня г. г. закончыць выдзяленьне калгасаў пад малочна-таварныя фэрмы і арганізацыйнае іх афармленьне дагаворамі.

На працягу чэрвеня м-ца ўкамплектаваць малочна-таварныя фэрмы жывёлай ня менш 70 проц. гадавога пляну за лік унутраных рэсурсаў саміх калгасаў — (абагульваньне) 6.300 галоў за лік перадачы фэрмам атрымнай з загатовак жывёлы і пераданай калгасам, якія не арганізуюць малочна-таварных фэрмаў — 8.000, праз абмен жывёлы паміж спэцыялізаванымі калгасамі — 6.000. Ужыць захады, каб на фэрмах была сканцэнтравана лепшая жывёла. Прапанаваць Белмясу, у асобе тав. Царонка забясьпечыць перадачу малочна-таварных фэрм 21.000 кароў ў 4-м квартале 1931 г.

2. Загадчыку Беларускага Аддзяленьня Малакоцэнтру і Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру на працягу дэкады распрацаваць і ажыцьцявіць практычныя мерапрыемствы, якія поўнасьцю гарантуравалі-б сваячасовае сканчэньне будаўніцтва ў фэрмах (пабудаваць новых абор на 30 тыс. галоў, прыстасаваць на 30.000 галоў буйнай рагатай жывёлы і прыстасаваць цялятнікаў на 10.000 галоў, сіласных веж 150), для чаго ўстанавіць каляндарныя тэрміны будаўніцтва па кожным раёне і фэрме і ўвесьці падэкадную справаздачу аб ходзе будаўніцтва, маючы на ўвазе, што будаўніцтва сіласных установак павінна быць скончана да 15 ліпеня і абор цялятнікаў і інш. да 15 кастрычніка г. г.

Пры правядзеньні будаўніцтва зьвярнуць асаблівую увагу на эканомію дэфіцытных будаўнічых матарыялаў і за мену іх мясцовымі.

Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру праверыць выкананьне сваіх дырэктыў аб арганізацыі калгасных будаўнічых брыгад і іх скарыстаньні.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Аддзяленьню Малакоцэнтру прасачыць за сваячасовым прасоўваньне будаўнічых матар'ялаў да месца пабудовы.

3. Прапанаваць Аддзяленьню Малакоцэнтру і Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру засіласаваць у калгасных малочна-таварных фэрмах ня менш 235 тыс. тон сіласнай масы, на працягу месяца склаўшы кармавы баланс па фэрмах, устанавіўшы патрэбную колькасьць кармоў і забясьпечыўшы ў час правядзеньня ўборачнай кампаніі загатоўку кармоў на калгасным малочна-таварным фэрмам і такі парадак выдаткаваньня кармоў па фэрмах, які забясьпечыў-бы максымальную эканомію і рацыянальнае скарыстаньне іх, забараніць скормліваньне сенажацяй жывёлы.

4. Прапанаваць Белсельбуду пад адказнасьць тав. Сьлёўкіна, на падставе заключанай умовы забясьпечыць сваячасовую і сыстэматычную тэхнічную кансультацыю ў будаўніцтве малочна-таварных фэрм.

5. Прапанаваць аддзяленьню Малакоцэнтру і Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру на працягу дэкады дабіцца рашучага пералому ў здачы таварнай прадукцыі. Даць месячныя і дэкадныя заданьні кожнаму раёну і фэрме па здачы малака і малочных прадуктаў з тым, каб у рашучыя месяцы — чэрвень—жнівень быў выкананы плян здачы гэтай прадукцыі, вядучы рашучае змаганьне з асяданьнем малака ўнутры калгасаў.

6. Абавязаць Аддзяленьне Малакоцэнтра спыніць выпадкі разбазаваньня малака без нарадаў Саюзмалако. Абавязаць Саюзмалако, ў асобе тав. Кузьняцова, сваячасова забясьпечыць нарадамі на здачу малака і малочных прадуктаў малочна-таварнымі фэрмамі, а таксама ўжыць захады да забясьпечваньня малочна-таварных фэрм малочнай пасудай і інвэнтаром.

7. Даручыць Белкаапсаюзу і Белхлебжывёлсаюзу, пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў гэтых устаноў, т. т. Хаскіна і Жыромскага, на працягу дэкады зьвярнуўшы усе недахопы ў працы пунктаў па загатоўцы малака, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на забясьпечаньне іх малочнай пасудай і інвэнтаром і поўнае скарыстаньне малочных адкідаў на перапрацоўку, на дасканалы падлік загатаўляемай прадукцыі асобна па калгасным сэктары і малочна-таварным фэрмам. Безадкладна пагасіць запазычанасьць калгасам за малако і малочныя прадукты і не дапускаць гэтай запазычанасьці на будучы час. Не дапушчаць скарыстаньня не на прызначаныя дэфіцытных тавараў, якія прадназначаны для забясьпечаньня малочна - таварных фэрм, за здаваемую імі прадукцыю ў разьмеры 35 проц. кошту здадзенага малака.

8. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства забясьпечыць падрыхтоўку 210 тэхнікаў жывёлаводаў праз 6-ці месячныя курсы; Белкалгасцэнтру і Аддзяленьню Малакоцэнтру забясьпечыць падрыхтоўку 3.800 жывёлаводаў, а таксама ўжыць захады да падрыхтоўкі кадраў іншых масавых кваліфікацый для абслугоўваньня малочна-таварных фэрм. Гэтую працу скончыць да 1 студзеня 1932 г.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства на працягу тыдня забясьпечыць ажыцьцяўленьне сваёй пастановы аб перадачы зоатэхнічнага і вэтэрынарнага пэрсаналу для абслугоўваньня малочна-таварных фэрм з сыстэм сельскагаспадарчай капэрацыі і зямельных органаў.

9. Абавязаць Белкалгасцэнтр і Аддзяленьне Малакоцэнтру і раёнах,—з найбольшай калькасьцю фэрм увесьці ўпаўнаважаных Малакоцэнтру.

10. Абавязаць Аддзяленьне Малакоцэнтру і Кіраўніцтва Белкалгасцэнтру не пазьней і ліпеня г. г. перавесьці ўсе малочна-таварныя калгасныя фэрмы на зьдзельнічыну, забясьпечыўшы пры гэтым падлік работы на колькасьці і якасьці атрымліваемай прадукцыі, максымальнае палепшаньне арганізацыйнага абслугоўваньня калгасных малочна-таварных фэрм, мабілізаваўшы вакол выкананьня пастаўленых задач перад калгасамі малочна-таварнымі фэрмамі шырокія калгасныя масы, на падставе шырокага ўкараненьня сацыялістычных мэтадаў працы—сацсаборніцтва і ўдарніцтва

11. Адзначаючы недаацэнку штучнага абсемяненьня нізавымі калгаснымі зямельнымі органамі, абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр і Малакоцэнтр забясьпечыць практычную работу па правядзеньні мерапрыемстваў па мэтысьцязыці пагалоўя буйнай рагатай жывёлы за лік найлепшай пароды на тэрыторыі БССР, а таксама на правядзеньні штучнага абсемяненьня і па пераводу ацёлу кароў на працягу усяго году.

12. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр і Аддзяленьне Малакоцэнтру на працягу месяца распрацаваць і падаць на разгляд Эканамічнага Савету абём мерапрыемстваў па арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм у 1932 г.

13. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы забясьпечыць сыстэматычны кантроль і кіраваньне працай па арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм практычна дапамагаючы адбору калгасаў, правядзеньню будаўніцтва і забясьпечаньню мясцовымі будаўнічымі матар'яламі, падрыхтоўцы кадраў і стварэньні сталай кармавой базы, а таксама ўкамплектаваньні стада.

Папярэдзіць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы, што яны нясуць адказнасьць за выкананьне праграмы будаўніцтва калгасных малочна-таварных фэрм наўпрост з арганізацыямі, якія беспасрэдна выконваюць гэтую пастанову.

14. Прапанаваць Белкалгасцэнтру і Аддзяленьню Малакоцэнтру разгарнуць масавую работу навакол задач па арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм. Абавязаць цэнтральны мясцовы друк забясьпечыць асьвятленьне ходу працы па арганізацыі калгасных малочна-таварных фэрм.

Абавязаць Белдзяржвыдавецтва выдаць масавую папулярную літаратуру па арганізацыі і тэхніцы вядзеньня малочных гаспадарак.

15. Адказнасьць за выкананьне гэтай пастановы ўскласьці на загадчыка Аддзяленьня Малакоцэнтру тав. Рыневіча, старшыню Белкалгасцэнтру тав. Міцькова.

Адказнасьць за нагляд, кантроль і кіраваньне выкананьнем гэтай пастановы ўскласьці на нам. Народнага Камісара Земляробства тав. Масюкова.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР

А. Калінін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР

С. Кандыбовіч.

14 чэрвеня 1931 г.
гор. Менск.

ПА БССР

Да суровай адказнасьці галавацяпаў

Магілёў, 14-VI. (Белта). Сёньня ў чатыры гадзіны раніцы на пабудаваным окураным заводзе імя т. Сталіна здарыўся вялікі няжар. Ня гледзячы на тое, што на тэрыторыі заводу быў просты провад, пажарную каманду на працягу гадзіны не паведамілі. Пажарная каманда заведалася аб пажара з каланчы і выехала толькі праз гадзіну. Адміністрацыя заводу загадзя не прыняла супроць пажарных мер. Вадзяны басэйн быў без вады, ўнутраныя рукавы ня працавалі. У выніку пажару згарэла тры цэхі: апрацоўчы, закройны і сушыльны. Меркуюць, што пажар адарыўся ад падпалу. Па прыблізных падліках страты толькі на таварах—500.000 руб. Вядзецца тэрміновае расьсьледваньне.

Трыкатажны камбінат будуецца недапушчальна марудлівымі тэмпамі

Віцебск, 14-VI. (Белта). Будаўніцтва панчошна-трыкатажнага камбінату ў апошні час вядзецца недапушчальна марудлівымі тэмпамі і без усялякага пляну. Кіраўнікі Белбудабіднаньня і панчошнай фабрыкі ствараюць грашовую цеганіну. Якасьць работы нездавальняючая. Апартуністычнае кіраўніцтва групкому прывяло прафработу да поўнага развалу. Групком не кіраваў ўдарніцкім рухам і не скарыстаў вопыт і прапановы рабочых. Белбудабіднаньне забрала з пабудовы лябёдкі і маторы і не зварочае іх, з-за чаго нельга пачаць работу на рацэ па забіўцы паль.

Стрэл клясавага ворага

Негарэлае, 14-VI. (Белта). На глебе клясавай помсты ў в. Мазыноўцы забіты з палуўнічай стрэльбы член сельсавету—актыўных калгаснік тав. Кісель Кастусь. Забойца — лясьнік, зрыў чынік калектывізацыі Данілові Язэп затрыманы. Вядзецца тэрміновае расьсьледваньне.

Віцебскі ЦРК не ўкамплектаваў жывёлагадоўчыя фэрмы

Віцебск, 14-VI. (Белта). Сельска-гаспадарчы аддзел ЦРК ня выканаў дырэктывы па арганізацыі і ўкамплектаваньні жывёлагадоўчых фэрмаў. Па пляну на вясну 1931 г. па ўсіх фэрмах ЦРК павінна было 1250 кароў, насіцца 1125. З патрэбнай колькасьці маладняка гадуецца толькі 93 проц.

Будаўніцтва абор зрываецца, а пачатае ў мінулым годзе ня скончана. Не хапае рабочай сілы і крэдыту. За забоем жывёлы на бойні ніхто не нагляда дае і там часта забіваюць малочную жывёлу

Прафсаюзная хроніка

Сёньня, 16-га чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары ў летнім саду фабрыкі «Кастрычнік» (Ленінская вул. супроць 1-ай Савецкай больніцы) адбудзецца шырокая агульна-гарадзкая нарада культмасавых сэктароў, культпалітсаветаў, рэдактароў насьцэнгазэт і шматтыражак Менскіх прадпрыемстваў, устаноў, і клюбаў па пытаньні аб папярэдніх выніках месячніка друку і задачах падрыхтоўкі да Усебеларускага зьезду рабселькораў. (даклад т. Курціц, інфармацыі культмасавых сэктароў і рэдактароў насьцэнгазэт фабрыкі «Чырвоны Тэкстыльшчык», заводаў «Камунар», «Бальшавік» і Дрэваапрацоўшчык).

Нарада заслухае і абгаворыць таксама даклад т. Клімковіча. аб задачах перабудовы культмасавай работы.

Апрача таго, на нарадзе будзе зроблена рад інфармацый аб культмасавым абслугоўваньні сэзоньнікаў, аб ходзе культэстафэты, аб мастацкім абслугоўваньні рабочых г. Менску і г. д.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

Пра ход арганізацыі сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм і здачы таварнай прадукцыі

Эканамічны Савет БССР адзначае, што пастановы СНК БССР за 3-І 31 г. «Пра ход укамплектаваньня статку спэцыялізаваных калгасаў сьвінаматкамі і прадукцыйнаю буйнаю рагатаю жывёлаю». (З. З. БССР 1931 г., аддзел II, № 2, паст. 6) і 3 сакавіка 1931 г. «Пра мерапрыемствы для разьвіцьця жывёлагадоўлі ў 1931 г. (З. З. БССР 1931 г. аддзел II, № 5, паст. 72), якімі было асабліва завострана пытаньне аб разьвіцьці прамыслова-таварнае сьвінагадоўлі ў калгасах і дадзены канкрэтныя заданьні па арганізацыі таварных калгасных фэрм, выконваюцца зусім нездавальняюча; на 1 чэрвеня 1931 г. арганізавана і афармлена дагаворамі 714 фэрм, альбо 55 проц. заданьня, укамплектаваны фэрмы сьвіным статкам на 14,8, здано таварнае прадукцыі за першую палову года 17,7 проц.

З прычыны дрэннай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону ход будаўніцтва сьвінарнікаў не забясьпечвае выкананьня будаўнічай праграмы па сьвінагадоўчым калгасным фэрмам, ня выкана на праграма падрыхтоўкі кадраў па сьвінагадоўлі (замест 220 тэхнікаў-сьвінаводаў падрыхтавана 100 і замест 2665 сьвінароў падрыхтавана 230) не забясьпечана беспасрэднае абслугоўваньне сьвіноводных калгасных таварных фэрм зоатэхнічным і вэтэрынарным пэрсаналам.

За паказанае становішча працы і невыкананьне дырэктыў СНК БССР аб разьвіцьці прамыслова-таварнай сьвінагадоўлі ў калгасах адказнасьць нясуць:

а) Беларускае Аддзяленьне Сьвіноводкалгасцэнтру, у асобе загадчыка т. Красоўскага, якое своячасова не забясьпечыла дагаворнае кампаніі па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм, заключэньне дагаворамі калгасамі з Белмяса на здачу таварных сьвіней, укамплектаваньне сьвінога статку ў фэрмах за кошт унутраных рэсурсаў саміх калгасаў, пастаноўкі сьвіней на адкорм і здачу таварнае прадукцыі, кіраваньне падрыхтоўкаю і самім будаўніцтвам па сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах і заціжку ў арганізацыі і ўкамплектаваньні апарату аддзяленьня;

б) кіраўніцтва Белкалгасцэнтру, якое недастаткова кіравала практычнай работай райкалгассаюзаў у галіне арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм, з прычыны чаго шэраг калгассаюзаў, асабліва: Смаляўніці, Лельчыцкі, Журавіцкі, Камарынскі, Капаткевіцкі, Койданаўскі, Юравіцкі натат да гэтага часу фактычна не разгарнулі працы на арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм, па заключэньні дагаворамі з Белмясам на здачу таварных сьвіней, недастаткова мабілізавалі калгасныя масы вакол мерапрыемстваў па арганізацыі сьвінагадоўчых калгасных фэрм, па пераводу іх на зьдзельнічыну і ня выканала пастановы СНК пра падрыхтоўку кадраў па сьвінагадоўлі;

в) Народны Камісарыят Земляробства, які несваячасова забясьпечыў будаваньне сьвінарнікаў тыпавымі праектамі ня выканаў пастановы СНК БССР аб падрыхтоўцы кадраў сярэдняй кваліфікацыі і не дабіўся своячасовай перадачы раёнамі зоатэхнічнага і вэтэрынарнага пэрсаналу для абслугоўваньня сьвінагадоўчых таварных і калгасных фэрм;

г) ВСНГ і Белсамтрамсаюз, якія несваячасова і нездавальняюча выканалі праграму па вырабу абсталяваньня для падрыхтоўкі кармоў;

д) Белсельбуд, у асобе дырэктара т. Сьлёўкіна, за незабясьпечаньне тэхнічнай кансультацыяй па будаваньні сьвінарнікаў, на падставе дагавору Белкалгасцэнтру СССР з Саюзсельбудам;

е) загатоўчыя арганізацыі: Белмяса, Белхлебжывёлсаюз і Белкаапсаюз—за неўстанаўленьне падліку таварнай прадукцыі сьвіней, якія здаюцца калгасамі з прычыны чаго абезьлічылася калгасная таварная прадукцыя;

ж) шэраг раённых выканаўчых камітэтаў асабліва Капаткевіцкі, Камарынскі, Рэчыцкі, Крупскі, Талачынскі і Барысаўскі, якія недаацанілі важнасьці разьвіцьця сьвінагадоўлі ў справе забясьпечаньня мясцовымі прадуктамі, што выразілася ў абсалютнай бязьдзейнасьці па выкананьні пастановы СНК аб разьвіцьці гэтай галіны гаспадаркі.

Эканамічны Савет папярэджвае усе калгасныя і зямельныя органы, а таксама і раённыя выканаўчыя камітэты, што слабае выкананьне памянёных пастаноў СНК, паставіла пад пагрозу выкананьне вытворчага пляну па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм і здачу таварнай прадукцыі для забясьпечаньня мясцовымі прадуктамі.

Выходзячы з гэтага Эканамічны Савет пастанаўляе:

1. Абавязаць Беларускае Аддзяленьне Сьвіноводкалгасцэнтру, Белкалгасцэнтр, Народны Камісарыят Земляробства скончыць вылучэньне і афармленьне дагаворамі сьвінагадоўчых калгасных фэрм, разгарнуўшы шырокую масавую працу вакол гэтае справы.

2. Прапанаваць Беларускаму Аддзяленьню Сьвіноводкалгасцэнтру, пад адказнасьць т. Красоўскага, працу па ўкамплектаваньні сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм ў асноўным скончыць да 1 жніўня 1931 г., укамплектаваньне сьвінога статку рабіць галоўным чынам за кошт унутраных рэсурсаў калгасаў, 33 тыс. сьвінаматак, якія ёсьць у сьвіноводчаскіх фэрмах папоўніць праз арганізацыю да 1300 дадатковых фэрм, абграмаджанага статку сьвінаматак на 10 тыс. галоў, за лік вясновага апаросу 48 тыс. галоў і за лік паставак Белмяса—12 тыс. галоў. Апроч таго дазволіць сьвінагадоўчым калгасным фэрмам для папаўненьня матачнага статку на фэрмах закупіць у межах свайго раёну матачнага матарыялу з вясновага апаросу ў колькасьці 70 тыс. галоў; таксама забясьпечыць пакіданьне ў фэрмах з асеньняга апаросу 47 тыс. галоў сьвінаматак для ўкамплектаваньня статку на пляну 1932 г.

3. Абавязаць Беларускае Аддзяленьне Сьвіноводкалгасцэнтру забясьпечыць поўнае выкананьне пабудовы сьвінаматарнікаў на 125 тыс. месц і адкормачнікаў на 195 т. месц для чаго да 1 ліпеня г. г. зрабіць праверку ходу будаўніцтва і кантроль за выкананьнем будаўнічае праграмы па сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах; а кіраўніцтву Белкалгасцэнтру забясьпечыць тэхнічны нагляд праз тэхнікаў райкалгассаюзаў.

Абавязаць дырэктара Белсельбуда т. Сьлёўкіна забясьпечыць тэхнічную кансультацыю па будаваньні сьвінарнікаў у сьвінагадоўчых калгасных фэрмах.

4. Прапанаваць Беларускаму Аддзяленьню Сьвіноводкалгасцэнтру засіласаваць у сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрмах ня менш 183.598 тон сіласнай масы, для эканоміі кармоў зьвярнуць асаблівую увагу ў летні пэрыяд на скарыстаньне выпасаў, не пазьней як праз месяц склаўшы кармавы баланс па фэрмах, устанавіўшы патрэбную колькасьць кармоў і забясьпечыўшы ў час правядзеньня ўборачнай кампаніі загатоўку кармоў па сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах і ўстанавіць такі парадак выдаткаваньня кармоў па фэрмах, які забясьпечыў-бы максымальную эканомію і рацыянальнае скарыстаньне іх.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства праверыць выкананьне гэтага артыкулу.

5. Прапанаваць Аддзяленьню Сьвіноводкалгасцэнтру забясьпечыць выкананьне пляну па здачы сьвінагадоўчымі калгасамі і сьвінагадоўчымі таварнымі калгаснымі фэрмамі 180 тыс. галоў сьвіней, для чаго на працягу пяці дзён распрацаваць месячныя пляны здачы таварных сьвіней і не пазьней 25 чэрвеня 1931 г. давесьці іх да кожнага сьвінагадоўчага калгасу, на падставе чаго кожнаму калгасу не пазьней 1 ліпеня г. г. заключыць умовы з Белмясам на здачу таварнай прадукцыі

Прапанаваць т. т. Красоўскаму і Царонку на працягу 3-х дзён устанавіць пункты здачы таварных сьвіней, прымацаваўшы да іх адпаведныя фэрмы і калгасы, абавязаўшы Белмяса весьці дэталёва падлік здачы таварнае прадукцыі калгасамі, не дапускаючы абезьлічваньня.

Прапанаваць Кіраўніцтву Белкалгасцэнтру прыцягнуць да адказнасьці старшыень райкалгассаюзаў, якія не разгарнулі да гэтага часу работы па арганізацыі фэрм і здачы таварнай прадукцыі.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства на працягу дэкады дабіцца пераводу вылучаных для работы ў сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах заотэхнікаў, якія працуюць у капэрацыйнай сыстэме і зямельных органах, і не пазьней 1 верасьня г. г. скончыць падрыхтоўку 220 заотэхнікаў - сьвінаводаў; Белкалгасцэнтру і Сьвіноводкалгасцэнтру забясьпечыць падрыхтоўку 2656 ст. сьвінароў, разгарнуўшы пры гэтым працу па падрыхтоўцы кадраў масавай кваліфікацыі сьвінароў і вэтэрынарных санітараў.

7. Для беспасрэднага апэрацыйнавыгворчага абслугоўваньня сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм прапанаваць Аддзяленьню Сьвіноводкалгасцэнтру і Белкалгасцэнтру ў асноўных сьвінагадоўчых раёнах вылучыць упаўнаважаных аддзяленьня Сьвіноводкалгасцэнтру.

Скончыць гэтую працу да 25 чэрвеня 1931 г.

8. Прапанаваць Аддзяленьню Сьвіноводкалгасцэнтру на працягу дэкады распрацаваць практычныя мерапрыемствы па арганізацыі працы ў сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах і па пераводу ўсяе працы на зьдзельнічыну, аплату калгасьнікаў і калгасьніц, якія працуюць у сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах, паставіць у залежнасьці ад якасьці догляду і кармленьня сьвіней, захаваньня маладняка, павялічэньня вагі адкормленых сьвіней і г. д., укараняючы сацыялістычныя мэтады працы—сацсаборніцтва і ўдарніцтва.

9. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на мэтысьцязыці сьвіней з лепшымі вытворчымі лініямі і ліку тых, якія ёсьць у сыстэме Калгасцэнтру, а таксама і ў Сьвіноводтрэсту.

10. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр, і Сьвіноводкалгасцэнтр на працягу месяца распрацаваць і падаць на разгляд Эканамічнага Савету абём мерапрыемстваў па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм у 1932 г.

11. Абавязаць раённых выканаўчых камітэты і гарадзкія саветы забясьпечыць сыстэматычны кантроль і кіраваньне работай па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм. практычна дапамагаючы адборы калгасаў, правядзеньню будаўніцтва і забясьпечаньню іх мясцовымі будаўнічымі матарыяламі, падрыхтоўцы кадраў і стварэньню сталай кармовай базы, а таксама укамплектаваньню статку.

Папярэдзіць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы, што яны нясуць адказнасьць за выкананьне праграмы будаўніцтва сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм наўпрост з арганізацыямі, якія беспасрэдна выконваюць гэтую пастанову.

12. Прапанаваць Сьвіноводкалгасцэнтру разгарнуць масавую работу вакол задач арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм. Абавязаць цэнтральны і мясцовы друк забясьпечыць асьвятленьне ходу працы па арганізацыі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм.

Абавязаць Белдзяржвыдавецтва выдаць масавую папулярную літаратуру па арганізацыі і тэхніцы вядзеньня сьвінагадоўчых гаспадарак.

13. Адказнасьць за выкананьне гэтай пастановы ўскласьці пэрсанальна на загадчыка Беларускага Аддзяленьня Сьвіноводкалгасцэнтру т. Красоўскага, Нам. Старшыні Кіраўніцтва Белкалгасцэнту т. Стрэле.

Адказнасьць за нагляд, кантроль і кіраваньне выкананьнем гэтай пастановы ўскласьці на Намесьніка Народнага Камісара Земляробства т. Масюкова.

14. Абавязаць ВСНГ, пад асабістую адказнасьць т. Амбражуласа, забясьпечыць выкананьне памянёнай пастановы СНК за 3 сакавіка 1931 г.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР

А. Калінін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР

С. Кандыбовіч.

14 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Фінплян другога кварталу па БССР выкананы толькі на 52,1 проц.

Узмацніць тэмпы мабілізацыі сродкаў насельніцтва

(На нарад е ў Наркамфіне БССР)

Пазаўчора ў НКФ БССР адбылася пашыраная нарада прадстаўнікоў цэнтральных устаноў і арганізацый. Нарада абгаварыла становішча работы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Нарада канстатавала нездавальняючы ход гэтай работы. Агульны плян мабілізацыі сродкаў за другі квартал па БССР выкананы толькі на 52,1 проц., (паводле апошніх вестак НКФ на 11 чэрвеня).

Асабліва слабымі вучасткамі на гэтым фронце зьяўляюцца асноўныя крыніцы мабілізацыі сродкаў: збор узносаў па падпісцы на пазыку «Пяцігодка ў 4 гады», укладаньні ў ашчадкасы, рэалізацыя абавязацельстваў «Сельгасабясьпячэньня».

Паводле вестак на 11-VI касавыя паступленьні па пазыцы «Пяцігодка ў 4 гады» па вёсцы склалі толькі 25,3 проц. плянавага заданьня на другі квартал і на 55,6—па горадзе. Некаторыя раёны, напрыклад, Заслаўскі, Копыскі, Ельскі, Капаткевіцкі і Межанскі зусім не далі вестак аб ходзе работы па зборы ўзносаў па пазыцы.

У гэты час некаторыя раёны дзе была добра пастаўлена гэта работа, далі досыць значныя паказьнікі: па Бялыніцкім раёне касавыя ўкладаньні на пазыку на 10-га чэрвеня складаюць 87 проц. квартальнага пляну, па Любаньскім—64, Койданаўскім—70.

Недапушчальна пастаўлена работа па зборы грошай на пазыку і па гарадох, у тым ліку і па Менску, які выканаў плян толькі на 45,3 проц. Гэта тлумачыцца тым, што тут работа ня была разгорнута належным парадкам, а гэта бязумоўна можна было-б зрабіць.

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў праз ашчадкасы таксама значна адстае: па БССР на 14-VI выканана 30,7 проц. квартальнага пляну. Некаторыя раёны, як відаць, зусім не разгарнулі гэтай работы. Напрыклад, Жлобінскі раён выканаў квартальны плян мабілізацыі вольных сродкаў насельніцтва толькі на 0,6 проц., Рэчыцкі—1,6 проц., Быкаўскі—3 проц., Буда-Кашалёўскі—5, Сеньнянскі—8,4 проц. Праўда, ёсьць раёны, дзе за гэтую справу ўзяліся сапраўды па-бальшавіцку (Клічаўскі—141 проц., Брагінскі—105 проц.) і гэта, як нельга лепш, сьцьвярджае рэальнасьць кантрольных лічбаў пляну.

За апошні час падцягнулася работа па рэалізацыі пазыкі Трактарацэнтру. Плян рэалізацыі па БССР выкананы на 80,9 проц. Але за тое, зусім недапушчальна праходзіць работа па рэалізацыі абавязацельстваў «Сельгаснабжэньня». Гэта работа амаль зусім правалена. Плян рэалізацыі абавязацельстваў на 11-VI выкананы па БССР толькі на 1,7 проц. У шмат якіх раёнах гэта работа зусім не разгорнута, а некаторыя раёны, як відаць, проста недаацэньваюць гэтай работы.

Аднак, магчымасьці разгарнуць гэтую работу былі ў наяўнасьці. Наркамфін БССР тав. Хацкевіч прывёў факт аб тым, што у Клічаўскім раёне, праз добра пастаўленую работу ў гэтым напрамку, было сабрана па падпісцы на абавязацельства 6.000 руб., што складае прыблізна каля 25 проц. ад сумы, сабранай на гэтую мэту па ўсёй БССР.

Важнай крыніцай мабілізацыі сродкаў зьяўляецца паянакапленьне на лініі спажывецкай капэрацыі, але і гэта работа праводзіцца нездавальняюча. Плян паянакапленьня па гарадох БССР выкананы на 64,7 проц., а па в